СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 8.24, 15.48, 7.24;
Віцебск — 8.21, 15.31, 7.40;
Магілёў — 8.13, 15.38, 7.28;
Гомель — 8.02, 15.43, 7.41;
Гродна — 8.38, 15.05, 7.27;
Брэст — 8.30, 17.15, 7.45.

МЕСЯЦ:
Апошняя квадра 16 снежня.

ІМЯНІНЫ:
Савы; Грацыяна, Багуслава.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

18 СНЕЖНЯ 1992 г.
пятніца, № 249 (22027)

РОЗГАЛАС

УКРАІНА СТАЛА БЛІЖЭЙ

17 снежня ў сталіцу Украіны Кіеў прыбыла ўрадавая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале са Старшынёй Савета Міністраў Вячаславам Кебічам. У Барыспальскім аэрапорце, дзе былі падняты дзяржаўныя флагі Рэспублікі Беларусь і Украіны, гасцей сустрэў прэм'ер-міністр Украіны Леанід Кучма. На лётным полі была выстраена ганаровая варта, прагучалі дзяржаўныя гімны дзвюх краін.

У той жа дзень Вячаслава Кебіча прыняў прэзідэнт Украіны Леанід Краўчук. Паміж імі адбылася сяброўская гутарка, у ходзе якой абмяркоўваўся шырокі круг пытанняў украінска-беларускіх адносін. У гутарцы прыняў удзел прэм'ер-міністр Украіны Леанід Кучма.

Пасля сустрэчы Леанід Краўчук і Вячаслаў Кебіч адказалі на пытанні ўкраінскіх і беларускіх журналістаў. Гаворачы аб прыярытэтах у адносінах паміж Украінай і Беларуссю, Вячаслаў Кебіч адзначыў, што іх шмат. Аб гэтым сведчыць і той факт, што ў ходзе візіту намечана падпісаць 19 важных дакументаў, якія датычаць гандлёва-эканамічных адносін, супрацоўніцтва ў ваеннай сферы, сумеснай дзейнасці па ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Калі гаварыць канкрэтна, сказаў Вячаслаў Кебіч, то Беларусь мае патрэбу ва ўкраінскім цукры, алеі, рэдкіх металах. Украіна таксама зацікаўлена ў шэрагу беларускіх тавараў. Прыярытэтам з'яўляецца і такая важная сфера, як стварэнне сумесных украінска-беларускіх прадпрыемстваў. А самае галоўнае — гэта абмен вопытам, работа на аснове поўнага даверу адзін да аднаго, узаемаразумення.

Адказваючы на тое ж пытанне, Леанід Краўчук заявіў, што ён падтрымлівае ўсё сказанае кіраўніком беларускага ўрада. Прэзідэнт дадаў, што абмен прадуктамі і таварамі — гэта першы крок да супрацоўніцтва. Ён важны. Але ўслед за гэтым, сказаў прэзідэнт Украіны, адкрываюцца перспектывы больш глыбокай інтэграцыі — у прамысловасці, будаўніцтве, сельскай гаспадарцы, навуцы, культуры. Размова ідзе не проста аб дзвюх дзяржавах, а аб краінах, якія маюць паміж сабой так многа агульнага, у тым ліку і праблемы, што неабходна сумесна вырашаць.

Гаворачы аб адносінах Украіны да СНД, Леанід Краўчук падкрэсліў, што Садружнасць была створана для цывілізаванага афармлення фактычнага распаду СССР, наладжвання цесных узаемавыгадных сувязей паміж яго былымі рэспублікамі. Аднак падзеі паказваюць, што эфектыўнасць Садружнасці аказалася нізкай. Неабходна самым сур'ёзным чынам дамовіцца: будзем мы дапамагаць адзін аднаму ці зноў дзейнічаць з пазіцыі дыхтату — хто мацнейшы, той і мае рацыю. Апошняга дапусціць нельга, гэта будзе вяртанне ў мінулае, сказаў прэзідэнт Украіны.

Сёння ж павінны адбыцца міжурадавыя перагаворы.

Кар. Укрінфарма А. ПЯТРУНЯ — спецыяльна для БЕЛІНФАРМА.

Інфармацыя з «зоны» — стратэгічны тавар, за які трэба браць грошы

Сенсацыйную заяву зрабіў на традыцыйнай прэс-канферэнцыі ў Дзяржкамчарнобылі народны дэпутат Рэспублікі Беларусь Анатоль Волкаў. Ён сцвярджае, што ў хуткім часе Прэзідыум Вярхоўнага Савета разгледзіць пытанне аб будаўніцтве атамнай электрастанцыі ў Беларусі. Што існуе нават ідэя размясціць гэтую станцыю ў «зоне», пад бокам у ЧАЭС. Абвінаваціўшы сусветнае ядзернае лобі і яго тутэйшых прыхільнікаў, Волкаў папярэдзіў: у атамнай энергетыкі ў рэспубліцы няма будучыні. Маючы на ўвазе, што ўзвядзенне станцыі не дапусціць грамадскасць.

Калі гаварыць па шчырасці, то не вельмі верыцца, каб сёння нехта ўзяў на сябе смеласць нават абмяркоўваць гэтую балючую тэму. Але сімптаматычна, што прыкладна тыдзень назад адзін урадавы служачы дастаткова сур'ёзнага рангу заклікаў журналістаў «пускаць на старонкі газет» тых вучоных, якія будуць абгрунтоўваць неабходнасць станцый на ядзерным паліве. Простае супадзенне?

У прэс - канферэнцыі ўдзельнічалі несумненныя аўтарытэты ад навукі, медыцыны і нават эканомікі. Іх актыўна распытвалі рэдактары раённых газет з месцаў, якія найбольш пацярпелі ад аварыі. За такую магчымасць, што прадаставілі нашым калегам-раённікам арганізатары, варта ім шчыра падзякаваць.

Журналісты даведаліся, што жыллё для перасяленцаў будзе будавацца пад абсалютна дакладную заяўку—толькі для тых, хто збіраецца пераязджаць. Што на Гомельскім заводзе пускавых рухавікоў наладжана вытворчасць сродкаў сарбцыйнай тэрапіі. І самі выказалі даволі слушную прапанову: калі ўжо падобна на тое, што рэспубліку пакінулі сам-насам з яе праблемамі, то хай замежнікі плацяць за навуковую інфармацыю па чарнобыльскай тэматыцы, а яна каштуе дорага. Бо дорага нам дастаецца.

Кар. «Звязды».

БУДУЦЬ НОВЫЯ ПОМНІКІ

ГРОДНА. Два новыя творы манументальнага мастацтва ўпрыгожаць абласны цэнтр у бліжэйшыя гады: гарвыканком прыняў рашэнне і дазволіў пабудаваць у горадзе помнікі ахвярам сталінскіх рэпрэсій і знакамітаму беларуска-польскаму паэту Адаму Міцкевічу.

УРАД І ПРАФСАЮЗЫ СЕЛІ ЗА СТОЛ ПЕРАГАВОРАЎ

Пачаліся перагаворы паміж Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь і Саветам Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Абодва бакі занепакоены растучым зніжэннем жыццёвага ўзроўню людзей, падзеннем вытворчасці.

Утвораны камісіі, якія сумесна пачалі разгляд пытанняў, што закранаюць інтарэсы шырокіх слаёў насельніцтва. Гэта занятасць, стрымліванне росту цэн, павышэнне мінімальнай заработнай платы, забеспячэнне насельніцтва жыллём, індэксацыя грашовых укладаў, прыватызацыя ў інтарэсах працоўных калектываў, мэтазгоднасць замацавання ў заканадаўчым парадку лакаўту.

Абмяркоўваюцца канкрэтныя меры, накіраваныя на сацыяльную абарону людзей, забеспячэнне стабільнасці ў грамадстве.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь—БЕЛІНФАРМ.

ВІЗІТ А. БРАЗАЎСКАСА НА БЕЛАРУСЬ

Сёння ў Мінск з аднадзённым рабочым візітам прыбывае выконваючы абавязкі прэзідэнта Літоўскай Рэспублікі пан Альгірдас Бразаўскас. У праграме візіту сустрэча са Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіславам Шушкевічам, а таксама перагаворы са Старшынёй Савета Міністраў Вячаславам Кебічам аб развіцці добрасуседскіх адносін і ўзаемавыгадных гандлёва-эканамічных сувязей паміж Беларуссю і Літвой. Запланавана выступленне высокага госця перад дэпутатамі беларускага парламента.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

НА СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РБ

«У Беларусі пачалася перадвыбарная кампанія...»

БСДГ прапанавала ўстанавіць мінімальную зарплату ў размеры чатырох тысяч рублёў

Не-не, палохацца не трэба, да чарговых выбараў яшчэ багата часу. Аляксандр Сасноў, старшыня Камісіі па пытаннях працы, цэн, занятасці і сацыяльнай абароны насельніцтва, проста пажартаваў. Хоць падстаў для жартаў, здаецца, не было: на ўчарашнім ранішнім пасяджэнні Вярхоўнага Савета пасля скарацечнага абмеркавання і прыняцця закона «Аб пенсіённым забеспячэнні ваеннаслужачых» дэпутаты распачалі разгляд больш чым сур'ёзнага пытання аб мінімальнай заработнай плаце ў Рэспубліцы Беларусь. Фракцыя Грамады ў беларускім парламенце і група іншых народных дэпутатаў прапанавалі ўстанавіць мінімальны ўзровень зарплаты з 1 студзеня 1993 года ў размеры 4 тысяч рублёў. Вось гэтая лічба і «рассмяшыла» дэпутата А. Саснова, які лічыць, што на абываталя сёння іграюць усе, у тым ліку і БСДГ, якая хоча набраць ачкі, не маючы ў той жа час сур'ёзнай праграмы вываду краіны з эканамічнага крызісу.

Старшыня Дзяржэканомплана Беларусі С. Лінг, які прадстаўляў праект закона па гэтаму пытанню ад імя ўрада, заявіў, што ўстанаўленне мінімальнай зарплаты ў 4 тысячы, — справа на сённяшні дзень нерэальная, гэта падман людзей. «Мы дачакаемся чарговага абвальнага росту цэн, і нічога іншага», — лічыць ён. Менавіта зыходзячы з магчымасцей бюджэту рэспублікі ўрад прапанаваў узровень мінімальнай заработнай платы павялічыць да 3 тысяч рублёў. Сяргей Сцяпанавіч у сваім выступленні прывёў многа лічбаў аб мінімальным спажывецкім бюджэце ў Беларусі, аб узроўні сярэдняй заработнай платы ў нас і нашых суседзяў (якія, каб не заблытаць чытача, мы прапускаем) і заклікаў дэпутатаў падтрымаць прапанову ўрада.

Амаль паўтары гадзіны доўжылася абмеркаванне паступіўшых прапаноў. Фінансісты лічаць, што 4 тысячы мы не вытрымаем, дэпутаты Грамады і Федэрацыі прафсаюзаў, наадварот, заявілі, што 3 тысячы нас не выратуюць. Дэпутат У. Заблоцкі лічыць, што, наогул, без вырашэння пытання аб уласнасці нельга разглядаць і пытанне аб заработнай плаце. Была вылучана таксама і кампрамісная прапанова: 3 тысячы, але з 1 снежня.

Усё вырашыла галасаванне. 219 дэпутатаў выказаліся ў падтрымку прапановы ўрада і толькі 71—за альтэрнатыўную. Такім чынам, 3 тысячы рублёў з 1 студзеня 1993 года — такой будзе мінімальная заработная плата ў Беларусі.

Затым літаральна за некалькі хвілін дэпутаты абмеркавалі змяненні ў Папраўчапрацоўны кодэкс Беларусі, якія прадставіў міністр унутраных спраў У. Ягораў, і хутка падтрымалі ўнесеную пастанову, якая павінна «наблізіць наша заканадаўства да нормаў міжнароднага права» і, адпаведна, становішча тых 32.394 чалавек, якія на сённяшні дзень знаходзяцца ў месцах не надта аддаленых».

Яшчэ адно складанае і важнае пытанне было вырашана да перапынку: «Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацый у РБ». «Цяпер мы маем сапраўды законную падставу для свабоднага веравызнання», — такімі словамі С. Шушкевіч падвёў вынік абмеркавання законапраекта.

На дзённым пасяджэнні ў 16 гадзін дэпутаты меліся вярнуцца да разгляду, бадай, самага галоўнага пытання — аб праекце Канстытуцыі.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

Патрэбна Акадэмія мастацтваў Беларусі

Ліст Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ШУШКЕВІЧУ С. С.
Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь КЕБІЧУ В.Ф.

Кожная эпоха застаецца ў гісторыі народа перш за ўсё тым, што было створана ў яе час. Непарушную гісторыю нацыі, яе спадчыну стварае культура. Разам з навукаю грамадскую свядомасць фармуе мастацтва, і яго ролю ў гэтым працэсе ніякая другая сіла выканаць не можа. Мастацтва стварае традыцыйны светапогляд народа, яго духоўны вобраз і гістарычны твар. Толькі духоўная, гуманітарная культура і ў першую чаргу літаратура і мастацтва здольныя выхаваць у чалавека цэласнае светаўспрыманне, адносіны да жыцця, традыцыйнае разуменне сэнсу свайго існавання і сваёй працы. Мастацтва вучыць творчаму мысленню і ўводзіць чалавека ў свет нацыянальнай і сусветнай культурнай спадчыны. Выхоўвае самасвядомасць, мараль і сумленне. Іншымі словамі, мастацтва нясе чалавеку тое, што робіць яго чалавекам. Так склаўся гістарычны лёс нашай культуры, такая традыцыйная роля мастацтва ў жыцці.

Але ў стане эканамічнага заняпаду і разбурэння грамадскіх структур мастацтву пагражае вялікая небяспека. Яно можа панесці страты, якія немагчыма будзе аднавіць. Знікненне традыцый высокага мастацтва і літаратуры вядзе да знішчэння значнай часткі культуры ўвогуле. Класічнае мастацтва, таксама як і фундаментальная навука, акрэсліваюць узровень духоўнага жыцця народа, яго інтэлектуальную сталасць і самастойнасць. Гібель духоўнай культуры законапаложна прывядзе да страты нацыянальнай самасвядомасці і духоўнага знікнення народа.

Каб культура магла процістаяць гэтаму працэсу, яна павінна мець пэўныя структуры, здольныя захаваць яе традыцыі і набыткі. Ва ўсім свеце каштоўнасці, традыцыі і метады стварэння класічнага мастацтва, фундаментальнай культуры захоўваліся і развіваліся ў сцянах акадэмій.

Таму, у мэтах захавання і развіцця культурнай спадчыны, творчых традыцый і ўзроўню класічнага мастацтва, павінна быць створана Акадэмія мастацтваў Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўная шматпрофільная структура, якая будзе здольна

(Заканчэнне на 3-й стар.).

СПЕЦЫЯЛЬНА ДЛЯ «ЗВЯЗДЫ»

ПЫТАННЕ ЗДРАДЫ РАДЗІМЕ АКТУАЛЬНАЕ, ПАКУЛЬ ІСНУЮЦЬ ДЗЯРЖАВА І ВАЕННАЯ КОНТРРАЗВЕДКА

Першае інтэрв'ю дае газеце «Звязда» намеснік старшыні КДБ Беларусі, начальнік упраўлення ваеннай контрразведкі КДБ палкоўнік Валерый КЕЗ.

— Валерый Віктаравіч, асабіста ў мяне, ведаеце, пра вашу службу абмяжоўваюцца некалькімі мастацкімі кінастужкамі, дзе ваенная контрразведка выстаўляецца нечым накшталт царскай ахранкі.

— Сапраўды, пра нас мала ведаюць. Гэта было абумоўлена і нашай сістэмай, якая бачыла ворага на кожным кроку, і асаблівасцямі нашай службы. Да нядаўняга часу мы належалі трэцяму галоўнаму ўпраўленню Камітэта дзяржаўнай бяспекі СССР і падпарадкоўваліся загадам Масквы. І ўсё, што рабілі, дакладвалі адпаведна саюзным структурам. У студзені гэтага года пастановай ВС РБ мы ўвайшлі ў рэспубліканскую службу бяспекі, і такім чынам наша саюзнае падпарадкаванне скончылася. Я зусім нядаўна прашу начальнікам гэтага ўпраўлення, але выявіў ужо адну немалаважную рэч: сярод былых начальнікаў асабовых аддзелаў Беларускай ваеннай акругі не было ніводнага беларуса. Я не за тое, каб ваенныя контрразведчыкі былі толькі беларускай нацыянальнасці, але без напаўнення нашай службы нацыянальным зместам не абысціся. Галоўная задача контрразведкі ва ўсе часы і ва ўсіх дзяржавах была прыблізна аднолькавая — раскрываць і папярэджваць падрыўныя акцыі замежных разведак у адносінах да нашай дзяржавы.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ФАКТЫ

23 СНЕЖНЯ Ў БЕЛАРУСІ ПАЧЫНАЕЦЦА РЭАЛЬНАЕ СКАРАЧЭННЕ ЗБРАЕННЯЎ І ТЭХНІКІ. У гэты ж дзень на Барысаўскім бранятанкавым рамонтным заводзе возьмуцца за пераабсталяванне для выкарыстання ў народнай гаспадарцы баявых машын пяхоты. Да 23 снежня ў Барысаў прыбудзе замежная інспекцыйная група. Змогуць наглядаць за разбраеннем і журналісты.

БЕЛАРУСЬ ВЫБІРАЮЦЬ МЕСЦАМ ЖЫХАРСТВА І ЗАРУБЕЖНЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ. Дазвол на пражыванне ў віцебскай вобласці атрымалі маладыя спецыялісты з Непала і Бангладэш. Абодва яны вучыліся ў нашых вышэйшых навучальных установах, стварылі тут сем'і.

***

З МЭТАЙ УМАЦАВАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ СЯРОД ДЭПУТАЦКАГА КОРПУСА ПАРЛАМЕНТ МАЛДОВЫ ВЫРАШЫЎ ПРЫБЕГНУЦЬ ДА РАДЫКАЛЬНЫХ МЕР — пазбавіць прагульшчыкаў мандата. Дэпутаты ўжо прагаласавалі за выключэнне са сваіх радоў дзевяці калег.

***

МАГЧЫМА, У БЛІЖЭЙШАЯ БУДУЧЫНІ У ПРОДАЖЫ З'ЯВЯЦЦА ПЕРШЫЯ ГАЗАВЫЯ БАЛОНЧЫКІ І ПІСТАЛЕТЫ АЙЧЫННАЯ ВЫТВОРЧАСЦІ. Пра гэта паведаміў карэспандэнту РІА начальнік аддзела Міністэрства ўнутраных спраў Расіі Мікалай Скалазуб.

***

РАБОТНІКІ МАГАЗІНА № 1 БАРАНАВІЦКАГА АБ'ЯДНАННЯ «ПРАДУКТЫ» УКАРАНЯЮЦЬ СВОЙ СПОСАБ РАЗЛІКАЎ З ПАКУПНІКАМІ. Замест 50-капеечнай здачы тут даюць дробку солі, так што баранавіцкім пакупнікам у сумцы для прадуктаў разам з кашальком трэба насіць і мяшочак для солі.

ЦІ ЧАКАЦЬ УЗЛЁТУ ЦЭН?

Два тыдні засталося да Новага года,—два тыдні, якія аддзяляюць беларусаў ад новага скачка цэн. Сёння ўжо нікога не здзівіш інфармацыяй аб грандыёзным падаражанні прамысловых тавараў і прадуктаў харчавання ў 1993 годзе. Калі і можа нешта ўразіць людзей, дык гэта тое, што цэны на тэлевізары, халадзільнікі і іншую «дробязь» па прагнозах «народных прадказальнікаў» (дарэчы, інфармацыя якіх чамусьці карыстаецца вялікай павагай, у адрозненне ад урадавай) вырастуць у 6—8 разоў. Але, як кажуць, пакуль не грымнула, хрысціцца рана. Гэта так, аднак адсутнасць кампетэнтных заяў аб цэнах на асноўныя харчовыя і прамысловыя тавары пакідае прастору для палёту фантазіі і плётак. Дастаткова зараз бестурботнаму чалавеку апынуцца ў натоўпе, паслухаць размовы — і ўпэўненасць у заўтрашнім дні як рукой здыме. Вы паглядзіце, што зараз творыцца ў магазінах, у гігантах харчовага гандлю горада Мінска — «Сталічным» і «Цэнтральным». Шырокім асартыментам харчовых тавараў яны, на жаль, не песняць, затое чэргамі, наадварот, могуць пахваліцца. Людзі, якіх падштурхоўваюць чуткі аб павышэнні цэн на асноўныя харчовыя тавары да канца гэтага года, размятаюць усё.

Як паведаміў газеце «Звязда» Уладзімір Міхасёў, начальнік Дэпартамента цэн Дзяржэканомплана, цэны на асноўныя харчовыя тавары, камунальныя паслугі і медыкаменты да канца гэтага года павышацца не будуць.

— І ў 1993 годзе цэны на асноўныя харчовыя тавары, камунальныя паслугі, медыкаменты будуць рэгулявацца дзяржавай. Размовы аб тым, што ўрад выпускае на свабоду цэны на гэтыя тавары і паслугі, ніякіх падстаў пад сабой не маюць. У Беларусі цяпер цэны больш нізкія на мяса, каўбасы, масла, чым у суседніх дзяржавах СНД, хаця сярэдняя зарплата амаль аднолькавая.

Канешне, калі Расія да канца 1992 года возьме арыентацыю на сусветныя цэны на энерганосьбіты (такая ідэя панавала ва ўрадзе, калі быў прэм'ерам Гайдар)—125 долараў за тону нафты, тады і Беларусі прыйдзецца падымаць цэны. Пакуль мы плацім Расіі 17—30 тысяч за тону нафты, а давядзецца, аддаваць 60 тысяч (і долар—500 рублёў). Калі на 1 працэнт падымаюцца цэны на энерганосьбіты, мы вымушаны ўвесь ланцуг закупачных, аптовых, рознічных цэн падымаць на 0,5—0,7 працэнтаў. Праўда, новы кіраўнік расійскага ўрада Чарнамырдзін хоча мець цвёрдыя цэны на энерганосьбіты — 15—20 тысяч рублёў за тону нафты да канца 1993 года.

Але што б там ні было, я хачу цвёрда сказаць: да новага года ніякага расшырэння спіса тавараў на свабодныя цэны не будзе.

Словам, Новы год беларусам можна сустракаць заспакоенымі: дзяржава пакідае за сабой права рэгуляваць цэны на асноўныя харчовыя тавары. Дзякуй Богу, вытворцы не змогуць цяпер пастаўляць гэтую прадукцыю ўтрыдорага, спасылаючыся на падаражанне энерганосьбітаў і рост зарплаты. Што ж, пры поўнай адсутнасці добрых навін (ніхто ж нам не абяцае, што ўсё будзе больш танным) такая навіна таксама радуе.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

З НОВЫМ ГОДАМ — З НОВАЙ ПЕРАДАЧАЙ

БАРАНАВІЧЫ. З пачаткам новага года ў горадзе з'явіцца мясцовае тэлебачанне. А падарунак такі баранавічанам вырашыла зрабіць вытворча-камерцыйнае прадпрыемства «Інтэкст», якое ўжо ўстанавіла ў былым старым парку перадатчык з радыусам дзеяння 25—30 км. Зараз для трансляцыі рыхтуюцца першыя «ролікі», якія можна будзе глядзець на 22-м канале ДМХ.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДА НОВАГА ГОДА ЗАСТАЛІСЯ ЛІЧАНЫЯ ДНІ. НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ЦЯЖКАСЦІ, МАЛА ЗНОЙДЗЕЦЦА ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ НЕ РЫХТУЮЦЦА СУСТРАКАЦЬ ГЭТА СВЯТА. ТАМУ «ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ» ДАЕ СЕННЯ НЕКАЛЬКІ ПАРАД У ДАПАМОГУ ГАСПАДЫНЯМ І ГАСПАДАРАМ НАПЯРЭДАДНІ НОВАГА ГОДА.

Святочны стол

Які стол без салатаў! А навагодні тым больш. Для яе падыдзе любая агародніна — свежая, вараная, квашаная, садавіна — свежая, сушаная, кансерваваная. Гатуюць салату перад падачай на стол, а запраўляюць у апошнюю хвіліну.

КАЛІ ПАДАБАЕЦЦА САЛАТА

З белакачаннай капусты і чарнасліву

Нарэжце саломкай свежую капусту, пасыпце цукрам, патрыце рукамі да з'яўлення соку, які потым адцісніце. Загадзя замачыце чарнаслівы. Калі ён набрыняе, дастаньце костачкі, плады нарэжце кавалачкамі. Натрыце на буйной тарцы свежую моркву. Усё змяшайце, дадайце разбаўленую вадой лімонную кіслату ці сок лімона. Падавайце, упрыгожыўшы чарнаслівам і кавалачкамі моркві.

400 г капусты, 100 г чарнасліву, 50 г моркві, лімонная кіслата, цукар.

З садавіны з тварагом

Расцеркі тварог, дадаць вяршкі, крыху солі і цукру. Маса павінна мець кансістэнцыю смятаны. Калі атрымаецца гусцейшай, разбаўце малаком ці сокам. Разынкі вымыць у цёплай вадзе, даць набрыняць і высушыць. Марынаваныя яблыкі нарэзаць кавалачкамі. У вішань дастаць костачкі. Усе кампаненты змяшаць з тварожным соусам. Выкласці ў салатніцу і ўпрыгожыць садавінай.

200 г яблыкаў, 200 г вішань (марынаваных), 100 г разынак, 250 г тварагу, 150 г вяршкоў, цукар, соль.

З сыру з яблыкамі

Пачысціць і нарэзаць яблыкі. Сыр нарэзаць дробнымі кубікамі. Змяшаць, заправіць соусам, прыгатаваным з алею з дабаўленнем крыху воцату ці віна. Выкласці ў салатніцу, пасыпаць зяленівам, упрыгожыць кавалачкамі яблыка.

200 г сыру, 200 г яблыкаў, 4 ст. лыжкі соусу.

З яблыкаў з арэхамі

Ачышчаныя яблыкі і сыр нацерці на буйной тарцы і заправіць соусам, прыгатаваным са смятаны з дабаўленнем цукру і фруктовага соку. Пасыпаць любымі здробненымі арэхамі.

300 г яблыкаў, 100 г сыру, 100 г арэхаў, 0,5 шклянкі соусу.

Эстонская салата

Адвараныя бульбу, моркву і марынаваныя агуркі нарэзаць дробнымі кубікамі, дадаць зялёны гарошак, нацёртыя на тарцы яблыкі, маянэз. Усё перамяшаць і выкласці ў салатніцу. Упрыгожыць кількамі і кавалачкамі варанага яйца.

6 кілек, 2 крутыя яйкі, 3 бульбіны, 2 моркаўкі, 2 агуркі, 2 ст. лыжкі гарошку, 2 яблыкі, 0,5 шклянкі маянэзу. Пры жаданні можна дадаць адвараннага мяса.

З агуркоў, рыбы, рысу, яек

Нарэзаць кубікамі салёныя агуркі і вараныя яйкі, дадаць 2 бляшанкі кансерваванай рыбы, шклянку гарачага адвараннага рысу (па магчымасці — масліны без костачак). Перамяшаць, выкласці ў салатніцу і заліць сумессю з алею, солі, молатага чорнага перцу і гарчыцы па смаку.

З фасолі

Фасолю зварыць у падсоленай вадзе (калі няма часу, дадайце ў ваду чайную лыжку цукру, тады фасоля зварыцца хутчэй), ахаладзіць. Дадаць нарэзаныя кубікамі агуркі, яблыкі, цыбулю, крутое яйко, смятану.

1,5 шклянкі дробнай фасолі, 1 салёны агурок, яблык, маленькая цыбуліна, 200 г смятаны, чайная лыжка гарчыцы, яйко, соль, перац, зяленіва пятрушкі.

СНЕГАВІК

Са звычайнага дражджавога цеста можна спячы булачку, якая складаецца з чатырох невялікіх шарыкаў — тры ўнізе, адзін зверху. Для снегавіка шарыкі трэба рабіць вялікімі, каб ён атрымаўся вялікім. Калі печыва астыне, яго пакрываюць глазурай.

Для глазуры прасейваюць цукровую пудру — 25 г, збіраюць у кучку, робяць зверху паглыбленне і ўліваюць туды лімонны сок (можна іншы). Узбіваюць бялок і часткамі палавіну пены ўліваюць у пудру. Перамешваюць і таксама часткамі ўліваюць астатні бялок. Масу ўзбіваюць міксерам хвілін дзесяць — яна павінна стаць бліскучай і пеністай. Паліваюць ёю снегавіка зверху, з галавы, адкрытыя месцы булкі можна замазаць лапатачкай. І адразу ж, пакуль не прасох, аздобіць — зрабіць з разынак вочы, з садавіны — нос і рот.

Такі апетытны снегавік упрыгожыць навагодні стол.

Торт «Мішка на Поўначы»

Расцерці 200 г размякчанага масла, дадаўшы шклянку цукру. У гэту масу ўліць 5 жаўткоў і добра ўсё перамяшаць. Потым уліць шклянку смятаны (200 г), усыпаць 0,5 чайнай лыжкі соды, пагашанай у сталовай лыжцы воцату. Соль — на кончыку нажа. Усё зноў перамяшаць і толькі потым увесці ванілін і муку. Мукі кладуць столькі, каб атрымалася не вельмі крутое цеста.

Раздзяліць цеста на тры бліны і выпякаць паасобку на патэльні (пячы на сярэднім полымі).

Падрыхтаваць начынку: 5 бялкоў узбіць да густой пены, дадаць паступова 0,75 шклянкі цукру. Усыпаць 1,5 шклянкі пасечаных грэцкіх арэхаў, асцярожна перамяшаць і змазаць бліны.

Прыгатаваць шакаладную памадку. Размяшаць 2 сталовыя лыжкі какавы і 0,75 шклянкі цукру, уліць 4 сталовыя лыжкі гарачага малака, добра размяшаць і паставіць на полымя, каб сумесь закіпела (старанна перамешваючы). Калі цукар поўнасцю растане, зняць з полымя і пакласці 70 г масла. Гарачай масай заліць торт зверху і паставіць у халадзільнік.

НАПІТКІ ДА СВЯТОЧНАГА СТАЛА

З КАЛЯРОВЫМ ІЛЬДОМ

Прыгатаваныя дома ліманады ці сокі можна падаваць у навагоднюю ноч з каляровым ільдом, які атрымліваецца пры замарожванні падсаладжаных фруктова-ягадных сокаў, кавы ці малака.

Разбаўленыя сокі, малако, каву падсаладзіце. У шклянку пакладзіце 2—3 кавалачкі лёду рознага колеру. Каляровы лёд можна падаваць у посудзе з тоўстага шкла, хрусталю ці мельхіёру.

ГАРАЧЫ ПУНШ

У шклянку наліце 20 г сіропу аднаго віду і 20 г другога, дадайце 3 шт. гваздзікі, кавалачак лімоннай цэдры, заліце гарачым моцным чаем.

ФЛІП З КАНЬЯКОМ

1 яйцо ўзбіць з цукрам і дадаць 30 г каньяку.

ФЛІП З ШАМПАНСКІМ

Узбіць 1 жаўток і 1 чайную лыжку цукру, дадаць 20 г лікёру, сок апельсіна і кавалачак лёду. Змяшаць, уліць у халодную шклянку і дапоўніць яе шампанскім.

ФЛІП З МАЛАКОМ

20 г каньяку, 2 ст. лыжкі згушчанага малака, 1 яйцо і 1 чашку малака добра перамяшаць, працадзіць праз дробнае сіта.

ШАКАЛАДНЫ НАПІТАК

200 г масла са 150 г цукру растапіць на слабым агні. Памешваючы, дадаць кавалачкі шакаладу (200 г) і даць ім растварыцца. Затым уліць бутэльку гарэлкі, і ўсё добра перамяшаць, не даводзячы да кіпення. Падаваць гарачым. (Расклад дадзены на 10—12 порцый).

ГАРАЧАЕ ПІВА

Ускіпяціць 1 л піва з 5 шт. гваздзікі і карыцай, працадзіць, патрымаць на слабым агні. Узбіць 4 жаўткі з 200 г цукру, паступова дадаючы гарачае піва. Падагрэць, пакуль маса не загусне (не даводзіць да закіпання). Падаваць у вялікіх шклянках (10—12 порцый).

ГЛІНТВЕЙН

1 л чырвонага віна ўскіпяціць з 200 г цукру, 6—7 шт. гваздзікі і крыхой карыцы. Падаваць гарачым.

ПЫТАННЕ ЗДРАДЫ РАДЗІМЕ АКТУАЛЬНАЕ, ПАКУЛЬ ІСНУЮЦЬ ДЗЯРЖАВА І ВАЕННАЯ КОНТРРАЗВЕДКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

У сувязі з тым, што ракетныя войскі стратэгічнага прызначэння пакуль яшчэ знаходзяцца на тэрыторыі рэспублікі, мы павінны не дапусціць у гэтых часцях другога Чарнобыля.

У нашу кампетэнцыю ўваходзіць таксама садзейнічанне камандаванню ў падтрыманні баяздольнасці войск на належным узроўні, а таксама гатоўнасці іх выканаць любую неабходную задачу.

— Апошняе, напэўна, нельга дасягнуць у дняпрашніх умовах без належнага захоўвання зброі і боезапасаў?

— Безумоўна. Мы выдатна разумеем, што канфлікты ў розных рэгіёнах былога Саюза не абыходзяцца без украдзенай у вайсковых часцях зброі з-за яе абсалютнай там бескантрольнасці.

Беларусь апошнім часам таксама стала вабіць раскрадальнікаў ваенай маёмасці. Калі ў мінулым годзе кулямётаў увогуле не было выкрадзена, то сёлета знікла з вайсковых складоў 14 кулямётаў. Праўда, усе яны былі знойдзены нашай службай сумесна з праваахоўнымі органамі. Аўтаматаў у 1991 годзе выкрадзена 9, у гэтым — 12, знойдзена 9, пісталетаў — 4, сёлета — 3, знойдзена 2, на гранаты паквапіліся толькі сёлета і адразу знеслі 91, знойдзена 65, міны і снарады сталі аб'ектам крадзяжу таксама толькі сёлета. Павінен пры гэтым сказаць, што ўкрадзеная міна была хутка знойдзена нашымі супрацоўнікамі. А крадуць цяпер усё, што ўяўляе сабой хоць нейкую каштоўнасць. Прыведу некалькі апошніх фактаў крадзяжу ваеннай маёмасці. У адной з часцей Барысаўскага гарнізона напярэдадні крадзеж са склада 15 прыбораў начнога бачання і камплектаў дэсантнага адзення. Усё гэта ацэньваецца прыблізна ў паўтара мільёна рублёў.

У адной з часцей Віцебскага гарнізона выяўлена нястача на суму 8 мільёнаў рублёў. У адным дывізіёне таго ж Віцебскага гарнізона начальнік (!) палігона быў саўдзельнікам адпраўкі ў Літву 3,5 тоны медзі. Узбуджана крымінальная справа. Увогуле, усе працэсы, што ідуць у грамадстве, адбіваюцца на арміі. Як бачыце, «медная» ліхаманка не абышла і вайскоўцаў. У Прыбалтыцы цяпер вялікі попыт на паліва? База ГЗМ адной з часцей Аршанскага гарнізона заключае дагавор з камерцыйнымі структурамі «Канверсія», «Гранула» і інш. на продаж 500 тон бензіну АІ-93 Беларускай інжынернай камерцыйнай арганізацыі забудоўшчыкаў (БІКАЗу). І тыя прадаюць яго па... старой ліцэнзіі № 62—1184 ад 11.09.92 г. падпісанай старшынёй Дзяржкамнафтапрадукта тав. Сурмачам.

Нягледзячы на гэту акалічнасць, той жа БІКАЗ спрабаваў усё роўна вывезці паліва ў Рыгу. За незаконную спробу вывазу паліва гэту арганізацыю аштрафавалі «ажно» на 8 тысяч рублёў. А кошт канфіскаванага бензіну склаў ні многа ні мала 15 мільёнаў рублёў.

Угору пайшлі цэны на боеприпасы. Вось літаральна свежы прыклад іх крадзяжу. 4 снежня затрыманы ваеннаслужачы тэрміновай службы радавы Ш., які ў змове з дзвюма цывільнымі асобамі спрабаваў прадаць 8 цынкавых скрыняў з 5,45-міліметровымі патронамі. У адной скрыні, да вашага ведама, 1.080 патронаў.

— І ўсё ж да арміі ў роўнай ступені мае дачыненне вядомая прымаўка: «Рыба гніе з галавы». Дзе кіраўніцтва не на вышыні свайго становішча, там і пачынаюць радавыя красці патроны скрынямі.

— Напэўна, вы маеце рацыю. Увогуле, пры расфарміраванні многіх часцей, іх скарачэнні знаходзіцца нямала жадаючых палавіць рыбку ў мутнай вадзе. І, як ні прыкра, ахвотнікі гэтыя ўсё больш у афіцэрскіх пагонах і з немалымі зоркамі.

У выніку ліквідацыі адной з часцей РВСН каля станцыі Коласава Мінскай вобласці ў яе камандзіра і начальніка ўлікова-аператыўнага аддзела наспела думка аб продажы алюміневага кантэйнера да міжбалістычнай ракеты для рэалізацыі яго за межамі РБ.

Мінскі кааператыў «Пірыт» закупіў і вывез з тэрыторыі ракетнага арсенала 500 тон стратэгічнага высакаякаснага алюмінію. Паводле даных кампетэнтных крыніц, «Пірыт» перапрадаў яго ў ЧСФР, і сума здзелкі склала 105 тысяч долараў. Пры гэтым кантэйнер да ракеты перавозіўся цераз граніцу як «труба зварачная з алюміневага сплаву».

Але гэта яшчэ не ўсё. Нашы вайсковыя гора-камерсанты хацелі прадаць буйныя партыі дзюралюмінію, запатрабаваўшы за гэту здзелку аўтамабіль запежнай вытворчасці. Пры фінансавай рэвізіі «Пірыта» ў даход дзяржавы было ўтрымана 2,5 мільёна рублёў.

Безумоўна, падобныя факты можна прыводзіць і далей. Засмучае ў гэтай сітуацыі адно — рэзанансна пасля раскрыцця іх нашай службай не заўсёды носіць канструктыўны і дзейсны характар.

— А можа, правамерна задаць пытанне: а суддзі хто? Успамінаю, як не мог у свой час дабіцца вынікаў праверкі па фактах службовых злоўжываванняў у Бабруйскай танкавай арміі ад кіраўніка ваеннай пракуратуры генерал-маёра Анатоля Глюкава.

— Ну, з Бабруйскай арміяй неяк усё ж разабраліся. Больш таго, Барысаўская танкавая армія таксама не была пакінута без належнай увагі ў сувязі з выкарыстаннем асабовага саставу ў карыслівых мэтах, а таксама разбазаваннем будаўнічых матэрыялаў на збудаванне дач і гаражоў для камандавання арміі. Камандуючы арміяй генерал Ісайчанкаў і начальнік штаба генерал Рамасенка зняты са сваіх пасад, а на намесніка камандуючага па тылу палкоўніка Іваніцкага заведзена крымінальная справа. Якімі б ні былі суддзі, яны, як бачыце, усё ж дзейнічаюць. І з нашай дапамогай таксама. Хоць, безумоўна, у любой справе шмат залежыць ад паводзін першых асоб. У даным выпадку, міністра абароны і яго намеснікаў. Асабіста я ведаю Паўла Паўлавіча Казлоўскага як высокасумленнага чалавека.

— Гэта пацвярджаецца і адпаведным дасье вашай службы на П. Казлоўскага?

— Зборам пэўнай інфармацыі мы займаемся толькі ў адносінах да асоб, якія, паводле нашых звестак, падтрымліваюць кантакт са спецслужбамі заходніх краін. Або, напрыклад, да асоб, схільных да крадзяжу зброі, іншых процізаконных дзеянняў. Напрыклад, у поле нашага зроку трапіў ваеннаслужачы К. каўказкай нацыянальнасці, які ў свой час ахоўваў склад узбраенняў у часці, дыслацыраванай каля Шчучына і які прыехаў з дому, каб дастаць зброю на сваім былым месцы службы. У гутарцы з нашымі супрацоўнікамі ён так і сказаў: «Дома мяне папярэдзілі, каб без пісталета ці аўтамата дамоў не вяртаўся».

— А вас не цікавіць паток зброі з паўднёвых рэспублік, якая вывозіцца асобнымі нашымі афіцэрамі адтуль і «выходзіць у народ» ужо тут, у Беларусі?

— Безумоўна, цікавіць. У нас неблагія сувязі з нашымі калегамі амаль ва ўсіх рэспубліках былога Саюза. Злачынствы не маюць межаў. І мы валодаем данымі па перамяшчэнню злачынных элементаў нават па-за межамі нашай рэспублікі, калі гаворка ідзе пра дзяржаўныя злачынствы, у тым ліку і крадзеж зброі. Думаю, што мы кантралюем сітуацыю са зброяй з іншых рэгіёнаў СНД. Вось нядаўна прыйшла тэлеграма аб затрыманні «небеларускага» аўтамата ППШ. Рэакцыя была хуткай — справа перададзена ў пракуратуру.

— Нас цяпер палохаюць грамадзянскай вайной, у тым ліку і афіцэрскімі бунтамі з-за незадавальнення значнай часткі афіцэрскага саставу сённяшнімі ўмовамі існавання.

— З усёй адказнасцю магу заявіць, што гаворка аб афіцэрскіх бунтах надуманая. Хоць пытанне аб сацыяльным статусе афіцэра і ваеннаслужачага ўвогуле трэба вырашаць тэрмінова, і на міждзяржаўным узроўні таксама. Афіцэр павінен быць упэўнены: калі ён закончыць у нас службу і захоча паехаць на сваю радзіму ў Курск, то там яму будуць выплачваць пенсію, і наадварот.

— Раней чырвонымі радкамі ва ўсіх службовых вайсковых характарыстыках праходзілі словы: «Справе Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада адданы». Ваша ведамства правяра ла баяздольнасць вайскоўцаў і па гэтых пунктах?

— З мінулага года ліквідаваны спецаддзелы палітычнага шкодніцтва. Хоць гэта не азначае, што трэба ва ўсім адкрывацца і глядзець у рот Захаду.

— Вы думаеце, што заходнім спецслужбам цяпер значна працей працаваць на тэрыторыі распублікі?

— Безумоўна. Іншаземцы цяпер могуць прыходзіць, куды хочуць і калі хочуць. Усё, што было дыслацыравана на тэрыторыі былой БВА, за выключэннем РВСН і ўрадавай сувязі, ужо вядома Захаду. Нават па батальёнах. Мы не можам падыходзіць да справы без кампанейшчыны. Дагавор аб звычайных узбраеннях у Еўропе, да якога далучыліся і мы, не прымушае нас даваць такія звесткі.

Наша ведамства таксама валодае інфармацыяй, што ў некаторых з 20 ваенных замежных інспекцый, якія праводзіліся ў нас, было да 50 працэнтаў супрацоўнікаў заходніх спецслужбаў. Мы ж не здолелі пакуль што наладзіць за мяжой ніводнай інспекцыі.

Як бы мы ні стараліся стаць адкрытымі, нацыянальныя інтарэсы патрабуюць дзяржаўных сакрэтаў. І нам проста неабходна выпрацаваць сістэму, якая іх надзейна ахоўвала б.

— А ці актуальнае цяпер пытанне здрады Радзіме?

— Яно актуальнае, пакуль існуе дзяржава. І наша служба ваеннай контрразведкі.

Гутарыў
Аляксандр КОКТЫШ.

У невялікім амерыканскім гарадку Рочэстэры жыве наша з вамі зямлячка, паэтка складанага лёсу Наталля Арсеньева. Грамадзянам сённяшняй Беларусі яна вядомая хіба што як аўтарка слоў гімна беларускай эміграцыі «Магутны Божа». Між тым, ёю напісаны і выдадзены некалькі зборнікаў паэзіі. Наталля Арсеньева прымала вельмі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці беларускай эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

Спадзяёмся, што гутарка са спадарыняй Арсеньевай будзе для вас цікавай і пазнавальнай.

НАТАЛЛЯ АРСЕНЬЕВА ПРА СЯБЕ І ЧАС

— Я жыву разам з сынам Уладзікам і ўнучкай. Ёсць яшчэ і ўнук, яму 30 гадоў. Мае ўласны дом, недалёка ад нашага. Так што мы бачымся час ад часу.

— Якія перыяды жыцця найбольш вам памятаюцца?

— Памятаю, як была эвакуацыя Вільні — гэта ў першую сусветную вайну. Нас тады прымусова эвакуіравалі, і мы трапілі ў Яраслаўль. Мне было нешта каля 12 гадоў... Я там пачала вучыцца ў гімназіі.

Цікавым, дарэчы, можа быць той факт, што да восені 1916 года ў Яраслаўлі жыў Максім Багдановіч. Яны хадзілі па адных вуліцах, але іх шляхі ніколі не перакрыжаваліся. Між тым, менавіта гэты паэт найбольш паўплываў на яе. У яраслаўскай гімназіі Наталля пачала спрабаваць пісаць вершы. Але, як сведчыць сама паэтка, «пісаць я пачала ня вельмі рана, у кожным выпадку не з пяцёх ці каб дзесяцёх год, як некаторыя «геніі». Не, у гэтым часе я любіла ўзімку чытаць, зашыўшыся недзе ў куток, а ўлетку — гайсаць па палёх і лазіць па дрэвах, што я рабіла лепш за хлопцаў».

— Вы напісалі свой першы верш у той час, калі ў Расіі адбылася сацыялістычная рэвалюцыя. Як яна ўвайшла ў свядомасць падлетка?

— Мы з сястрой Галяй ішлі з гімназіі і ўбачылі, як нейкія людзі ў вайсковым збіваюць з хаты вываз вялізнага арла — сімвала царскай імперыі. Адна лапа птушкі ўпала паблізу мяне. Было такое ўражанне, што раструшчылі жывую птушку. А я так любіла, ды і цяпер люблю розную жывёлу. З таго часу слова «рэвалюцыя» выклікае ў мяне асацыяцыі з разбурэннем, з насіллем. Рэвалюцыя, вайна — гэта страшна, агідна, гэта кроў, пакуты і гора людзей.

— У 1918 годзе вашы бацькі вырашылі вярнуцца з Яраслаўля ў Вільню. Неўзабаве яны рушылі ў шлях. Але толькі ў пачатку 1920 года апынуліся на месцы. Няўжо цэлы год дабіраліся?

— Так. Цяжкі быў шлях дадому. Вяртаючыся з бежанства, мы столькі перажылі... Часта траплялі пад перастрэлку. Было небяспечна. Знайшлі тады прытулак у вёсцы Жаўніна. Тут я ўпершыню, можна сказаць, пачула жывую беларускую мову. Гаспадары — Фадосся і Юрка сварыліся: «Чакай, чакай, я ўжо табе юшку пушчу!» Гэтак смачна, каларытна гучала слова. Але доўга мы там быць не маглі. З Краслаўкі хадзілі таварныя цягнікі ў Дзвінск. Мы неяк уціснуліся. А тут мост праз Дзвіну разбіты, цягнік далей не ідзе, трэба пераходзіць раку. Добра памятаю, як мы нейкія клункі цягнулі па лёдзе. А ў мяне і ў сястры гарачка, усё ў галаве круціцца. Як сёння бачу той дзень.

— Спадарыня Арсеньева, вы сказалі, што людзі ўцякалі з Расіі. Было месавае бежанства. Чаму? Баяліся бальшавікоў?

— Выязджалі эвакуіраваныя. Вярталіся дамоў. А пра бальшавікоў мы тады нічога кепскага не чулі. І ніхто нас не гнаў. Дык я хачу закончыць. На Дзвінскай станцыі я бачыла такое, што назаўсёды запала ў душу, перавярнула яе, уварвалася ў юнацтва цёмнай хмарай. На падлозе хворыя, параненыя. А ў дварэ станцыі — была ж лютая зіма — замерзлыя трупы польскіх жаўнераў; у недарэчных позах, з адкрытымі вачыма.

Нейкім дзівам мы дабраліся да Вільні, дзе мама наняла павозку і людзь жывых завезла нас да нейкіх людзей.

— У Віленскай гімназіі вы, напэўна, упершыню захапіліся беларускімі справамі? Раскажыце, калі ласка, хто там выкладаў і хто быў для вас найбольшым аўтарытэтам?

— У нас былі добрыя настаўнікі — Максім Гарэцкі, Антон Луцкевіч, Браніслаў Тарашкевіч, Аркадзь Смоліч. Яны навучылі мяне многаму. Дарэчы, я ўжо была трохі падрыхтаваная да заняткаў у гімназіі. Люба Русецкая прынесла мне беларускія кніжкі, пачала вучыць чытаць. Так я прачытала «Патаемнае» Гарэцкага. І з таго часу стала нераўнадушнай да яго твораў. Праніклася сімпатыяй да гэтага чалавека, паказвала яму свае вершы. Ён быў маім крытыкам і дарадцам.

Пра гады вучобы ў гімназіі паэтка неяк пісала: « Два гады навукі ў гімназіі... былі бадай найцяжэйшыя ў матэрыяльным дачыненьні гады майго жыцця, і што вельмі часта на працягу гэтых год даводзілася мне класьціся бязь вячэры, ці выходзіць у гімназію бязь сняданьня, я заўсёды ўспамінаю іх зь нейкай асаблівай любасьцяй і ўсхваляваннем. Можна сказаць, што якраз Віленская беларуская гімназія і зрабіла зь мяне беларускую паэтку Наталлю Арсеньеву, якая ня можа ня пісаць, як ня можа ня любіць Беларусі, што б ня сталася яшчэ на сьвеце».

— Скажыце, а хто на вас, як на паэтку, акрамя Багдановіча, меў яшчэ ўплыў?

— Купала. Увогуле, я шмат чытала, цікавілася паэзіяй. Мне запомніліся асобныя вобразы: Роланда, напрыклад, з французскай літаратуры. «Роланд усё трубіць і трубіць...» Метэрлінка любіла. Хаця пазней, калі больш глыбока спазнала расейскую літаратуру, на першае месца паставіла Пушкіна.

Дазволю себе маленькі каментарый: бацька Наталлі Арсеньевай паходзіў з таго роду Арсеньевых, які па сваёй жаночай лініі даў паэта М.Лермантава.

— Існуе такі стэрэатып уяўлення беларуса: ціхі, паслухмяны, разважлівы чалавек. А як вы вызначыце б беларускі характар?

— Беларусы — гэта мешаніна чыстых славянаў з балтамі. Лагоднасць, мяккасць, разважлівасць — гэта рысы якраз славянскія. Ёсць у нас крыху і летувіскай крыві. Украінцы, скажам, зусім іншыя, яны маюць продкаў з качэўнікаў паўдзённых.

— Як вы спазнавалі гісторыю свайго народа, яго культуру? Што вам дало найбольшае разуменне?

— У Віленскай гімназіі былі добрыя падручнікі. Хаця і не ўсе па-беларуску напісаныя. Да прыкладу, з падручніка геаграфіі Спірыдонава я ўпершыню даведалася пра беларусаў, што маюць яны сваю літаратуру, свайго вялікага паэта Купалу.

— Пасля заканчэння Беларускай гімназіі многія выпускнікі адправіліся на вучобу ў Прагу. У вас быў намер туды паехаць?

— Так. Але я не магла пакінуць бацькоў: яны былі старыя, немоглыя. І жылі толькі з таго, што я выкладала ў адной з беларускіх школак. А па-другое, я тады якраз пазнаёмілася з маім будучым мужам. Ён прасіў мяне застацца. Я прыйшла на станцыю, калі ад'язджалі мае калягі, толькі каб развітацца з імі.

У 1922 годзе Н.Арсеньева выйшла замуж за Ф.Кушаля і выехала з Беларусі ў Польшчу. Больш як 15 гадоў пражыла там. Але звычайна штогод наведвала сваю родную Вільню або Валожынчыну, мужавых бацькоў. Насупраць усім неспрыяльным абставінам, адарванасці ад Беларусі яна не кінула пісаць вершы. У 1927 годзе ўбачыў свет першы зборнік «Пад сінім небам», а ў 1935—1936 гадах падрыхтаваны да друку і другі. Калі чытаеш гэтыя вершы сёння, атрымліваеш вялікае эстэтычнае задавальненне. Яны вельмі далёкія ад палітыкі, ад тагачасных праблем, але ў іх — стыхія жыцця і прыроды; яны прасякнуты ціхай любоўю да роднай старонкі. Нягучныя, вытанчаныя пачуцці, нечаканыя вобразы і параўнанні. З усяго гэтага, як адзначаў М.Танк, паэтка ўмее вязаць надзвычай прыгожыя карункі.

Дзень асенні ўстае па-над нівамі,
працяючы вочы сьляпыя,
Яржавай рыжай лісьця ды анучамі
Брудна-шэрых туманаў абкручаны...

1939 год паклаў канец спакойнаму, але адностайнаму жыцьцю Н.Арсеньевай. Пачалася другая сусветная вайна. Муж яе, польскі вайсковец, трапіў у савецкі палон. Памерла ў Вільні маці. Яна з дзецьмі пераехала да брата ў Вілейку.

— Не баяліся! Хіба вы нічога не ведалі пра рэпрэсіі супраць «ворагаў народа»?

— Не. Нічога не ведалі. Жылі спакойна. Нікога не баяліся. Я мела адрас Максіма Танка, ён мяне ўладзіў працаваць у рэдакцыю «Вілейскай газеты» карэктарам. Бяда прыйшла нечакана. Ранкам грукнулі ў дзверы, загадалі: «Апранайцеся, збірайцеся, вы арыштаваны». Потым пагрузілі ў таварныя вагоны і завезлі ў Казахстан. І толькі перад самай вайной я вярнулася са ссылкі. Мне муж пасля расказваў, што, калі ён быў у палоне, прыйшлі і загадалі ўсім, хто ведае, дзе яго сям'я, пісаць ім лісты. Такім вось ашуканствам даведаліся адрасы сем'яў і сурова пакаралі жанчын і дзяцей.

— А як вам удалося так хутка вярнуцца са ссылкі? Шчаслівы выпадак?

— Мусіць што шчаслівы. За мяне хадайнічаў Купала. Напэўна, яму прыйшлося прыкласці шмат намаганняў, каб пераканаць пільных начальнікаў, што я ні ў чым не замяшаная. Дарэчы, па хадайніцтву таго ж Янкі Купалы быў вызвалены з лагера мой муж Францішак Кушаль. Разам з Купалам яны ў 1919 годзе працавалі ў Вайсковай камісіі. Інакш Францішка чакаў бы расстрэл.

— Як хутка пасля таго, калі сустрэліся з мужам, трапілі ў Мінск?

— Мы бачылі з Дораў, дзе жылі ў бацькоў мужа, як гараў Мінск. Вельмі хацелася даведацца, што з ім сталася. Некаторыя ўжо ездзілі, гаварылі, што там нейкі Беларускі камітэт ёсць. Нас гэта зацікавіла. Я вырашыла пайсці ў разведку, і са мною мужаў брат Пятрок. Ужо пад'ехалі пад самы Ракаў, як раптам — немцы. Арыштавалі нас і пасадзілі ў гміну. Седзячы ў гэтай гміне, я стала нявольнай сведкай таго, як немцы ажыццяўлялі акцыю знішчэння яўрэяў, як жаўнеры здзекаваліся, як пакутавалі людзі... Гэта жах...

Быў вецер...
Але я ім казалі засыпаць,
І за часіну ўсе і плясталі й сьпявалі.
Прысоўшы на бруку, брахаў у самы твар
Ім кулямёт загады сталяй...

(З верша «Акцыя». — Т.А.).

Пасля нас выпусцілі, і мы яшчэ раз паехалі ў Мінск.

— Расказвалі, якія былі ў людзей адносіны да немцаў, калі тыя ўвайшлі ў горад?

— Бачыце, людзі, якія ні за што пацярпелі ад Савецкай улады, а іх было не так ужо і мала, якраз сустракалі немцаў з надзеяй, як збавіцеляў. Па-другое: абсалютна ніхто не думаў, што немцы такія нелюдзі. Беларусы ж хацелі проста нападзіць свае культурнае жыццё.

— Але ж ці былі члены Беларускага камітэта такімі наіўнымі, што не разумелі, з якімі мэтамі прыйшлі фашысты на беларускую зямлю! Напрыклад, вы, спадарыня Арсеньева, ужо з першых дзён акупацыі былі сведкай жорсткай бесчалавечнай акцыі супраць яўрэяў.

— Беларусь і да вайны была пад чужынцамі. Савецкая ўлада метадычна знішчала цвет нацыі, яе інтэлектуальныя сілы. Таму прынцыповай розніцы не было. Абое рабое, як кажуць у народзе.

— Калі прыйшло працвераўжанне, разуменне таго, што ад немцаў нічога добрага чакаць не варта?

— На немцаў, фактычна, ніхто не спадзяваўся. Ілюзій абсалютна ніякіх не было. Думалі, як урваць нешта, каб аблегчыць жыццё нашых людзей ва ўмовах акупацыі. Нам нямала давялося пазмагацца за тое, каб немцы дазволілі адчыніць беларускія школкі... Настаўніцкая семінарыя дзейнічала, гімназія, фельчарская школа ў Баранавічах... Любую магчымасць для разгортвання беларускай справы мы стараліся выкарыстаць.

Немцы лютавалі. На 10 кіламетраў ад лясоў і пушчаў усё спалілі. Бо ад партызан не было ратунку. Фактычна, калі распачынялася акцыя, сяляне не хацелі пакідаць сваіх хат. І немцы спальвалі хаты з людзьмі. Цётку майго мужа так і спалілі разам з хатай. Моладзь маглі яшчэ насільна павыцягваць і адправіць у Нямеччыну, а са старымі не цырымоніліся, папалілі — і ўсё. Асабліва лютавалі немцы ў 1943—1944 гадах, перад канцом. І яшчэ: палілі ўкраінскія і літоўскія паліцыянты, зразумела, са згоды сваіх шэфаў-немцаў.

— Наколькі я ведаю, вы, спадарыня Арсеньева, працавалі ў час вайны ў «Беларускай газеце», што выходзіла ў Мінску. Я разумею, што гэта быў вельмі няпросты час. З аднаго боку, пры маўклівай згодзе акупантаў дзейнічалі беларускія школкі, выходзілі беларускія падручнікі; працаваў тэатр, падзіліся выстаўкі, а з другога — палалі вёскі з людзьмі, вывозілася ў Нямеччыну моладзь, вешалі і расстрэльвалі... Як жа вам працавалася?

— Я была прыпісана стылістам да рэдакцыі. Бо тых, хто не меў ніякай працы, вывозілі ў Нямеччыну. Майму сыну Владэку тады было 17 ці 18 гадоў. Яго таксама прыпісалі да газеты, ён быў пасыльным, вазіў матэрыялы ў друкарню.

А я такім чынам мела магчымасць пісаць вершы, перакладала на беларускую мову п'есы для нашага тэатра, стварала лібрэта. Шмат друкавалася ў нашай газеце.

Дарэчы, праца ў «Беларускай газеце» не гарантавала яе супрацоўнікам уласную бяспеку. Тым, хто пераходзіў межы дазволенага, пагражала хуткая расправа. Ледзь не паплацілася галавою за вдзін са сваіх вершаў і Наталля Арсеньева.

...Годзе!
Годзе нарэшце,
годзе
чарвякамі зьяівецца, поўзаць!
Хоць нас доля й дагэтуль зводзіць,
хоць ісьці нам пароў і поўзка, —
пасьмяёмся яшчэ і зь ліха!
Досыць падаць прад кожным ніцма!
Лепш на момант агнём успыхнуць,
чымся літасьцяй век давіцца!
Што далі нам калі чужыя?..

Як напятая струна, гучаў голас паэткі ў вершы «Годзе» апублікаваным у канцы 1942 года. І гэты настрой моцна не спадабаўся нямецкім уладам. Аўтарка была выклікана на допыт у палітычную паліцыю, і толькі ўделая інтэрпрэтацыя верша перакладчыцай Юльянай Дубейкайскай уратавала Арсеньеву ад рэпрэсій.

— Большую частку жыцця вы пражылі ў эміграцыі — Расія, Польшча, Казахстан, Нямеччына, Амерыка. Але ўвесь час вы — паэтка Беларусі, якая бясконца верыць у свой край, які дае натхненне, у свой народ, у яго вялікую будучыню. Цікава, якое ў вас ўяўленне пра сённяшнюю Беларусь, з якой вы расталіся амаль што 50 гадоў назад!

— Пра цяперашнюю Беларусь я няшмат ведаю, на жаль. Жыву даволі адасоблена. Хаця выпісваю часопісы, газеты. Шмат цікавага прысылаў мне звычайна Янка Запруднік з Нью-Йорка. Ён жа мае шмат літаратуры. Іншым разам я проста не магла зразумець, чаму Беларусь за ўсе гэтыя гады перастала быць беларускай. У маю бытнасць яна была яшчэ беларускай. Што здарылася? Як магло гэтак стацца?

Апошнім часам мне пішуць лісты з Беларусі даследчыкі, паэты. Я ім адказваю з радасцю. Для мяне гэта тоненькая нітачка сувязі з далёкай Бацькаўшчынай.

...Каля чатырох гадзін гутарылі мы з Наталляй Арсеньевай. Яна б яшчэ працягвала і працягвала, з неверагоднай дакладнасцю прыгадваючы падзеі 50 ці нават 70-гадовай даўнасці. У манатоннай яе споведзі ні разу не з'явілася англійскае слова. Адным простым сказам яна магла намаляваць цэлую карціну, гэткі жывапісны партрэт часу. З гукамі, пахамі, колерамі. Падумалася, якая ж гэта несправядлівасць, глупства, нарэшце, што беларускі народ дасюль не ведае сваю паэтку. Паэтку складанага лёсу і вялікага таленту.

Гутарыла Таццяна
АНТОНАВА.

ГАЛАСЫ ДЫЯСПАРЫ

Упакоўка для падарунка

Навагодні падарунак можна загарнуць у прыгожую паперу, пакласці ў поліэтыленавы пакет і завязаць яго бантам, але лепш зрабіць для яго спецыяльную скрыначку — з кардону, абклеенага тканінай ці паперай, размаляванымі яркімі фарбамі.



Вось якія можна зрабіць скрыначкі.

1. **Куб**, бок якога роўны 30 см. Па чарцяжу 1 выкрайце дзве дэталі.

2. Паралелепіпед даўжынёй 25 см, шырынёй 20 см, вышынёй 10 см. Па чарцяжу 2 выкрайце дзве дэталі.

3. **Пірамідa**, бакі якой роўныя 30 см. Выкрайце яе па чарцяжу 3.

4, 5, 6. **Цыліндры.** Самы вялікі (4) мае вышыню 50 см, дыяметр 20 см. Трэба выразаць два кружочкі дыяметрам 20 см, прамавугольнік размерам 30х63 см, які скруціць у трубачку.

Другі цыліндр (5) мае вышыню 40 см, дыяметр 10 см.

Трэці, нізкі цыліндр (6) мае вышыню 10 см, а дыяметр 25 см.

7. **Цыліндр**, зрэзаны наўскасяк (4). Выразаць эліпс і бакавую частку. Акрамя таго, для донца выразаецца кружок дыяметрам 30 см.

Спачатку начарціце на кардоне фігуры, дадзеныя на чарцяжы, потым выражце іх нажніцамі. У месцах, якія памечаны пункцірам, сагніце дэталі. Каб форма трымалася лепш, часова зацісніце згібы прышчэпкамі для бялізны ці канцылярскімі сашчэпкамі.

На адзін сантыметр ад краю дэталей прачарціце лінію, на якой зрабіце меткі праз кожныя два сантыметры. Тут павінны быць дзірачкі — іх можна зрабіць дыраколам. Праз гэтыя дзірачкі, выкарыстоўваючы вузкую стужку (шырынёй не больш 5 мм) змацуйце скрыначкі. Даўжыня стужкі ў два разы большая за даўжыню неабходнага шва.

Пакладзіце ўнутр падарунак яшчэ да таго, як зробіце апошнія «прашыўкі».



Ёлачныя цацкі

ЖАРТАЧКІ

Складзіце напалам палоску каляровай паперы (мал. 1а), закруціце ў розныя бакі яе канцы, прымацуйце нітку, каб можна было павесіць упрыгажэнне на ёлку.

З палоскі каляровай паперы склейце кальцо. Яшчэ дзве меншыя палоскі прасуньце праз яго. Склейце іх, выражце канцы зубчыкамі (1б).

МАТЫЛЁК

Выражце з каляровай паперы дзве доўгія і дзве кароткія палоскі. Палоску кардону складзіце ўдвая, каб атрымалася тулава матылька. Палоскі, якія будуць крыламі, сагніце, не перагінаючы поўнасцю, і прыклейце да тулава. Прыклейце вочы і вусікі з каляровай паперы (мал. 2).

ПАВЕТРАНЫ ШАР

У дзірку ў яечнай шкарлупіне ўстаўце два зробленыя з паперы гармонікі — адзін даўжэйшы, другі — карацейшы. У другую дзірку — кавалак запалкі з прывязанай да яе ніткай, каб цацку можна было павесіць на ёлку. Абклейце яйцо палоскамі каляровай паперы ці расфарбуйце (мал. 3).

ПАДВЕСКА

У гэтым выпадку ў яечную шкарлупіну з двух бакоў устаўляецца складзеная гармонікам каляровая папера. Тут жа мацуецца і нітка-пятля для падвешвання. Цацка ўпрыгожваецца рознакаляровымі кружочкамі, квадрацікамі, зорачкамі (мал. 4).

ВАЎЧОК

З кардону выражце два кругі радыусам 3 см, выкіньце з іх сегмент, а потым акуратна падрэжце краі. Склейце два канцы. Пасля гэтага выражце яшчэ адзін круг дыяметрам 4 см, упрыгожце яго краі каляровай паперай па густу. Цяпер збярыце ваўчок: на нітку навіжыце пацерку, працягніце нітку паслядоўна праз вяршыню ніжняга конуса, цэнтр круга і вяршыню верхняга конуса. Канец ніткі завяжыце пятлёй і замацуйце (мал. 5).

ЁЛАЧКА

Падстаўкай для ёлачкі служыць палавіна драўлянай катушкі для нітак, у якую ўстаўляецца драўляная палачка даўжынёй 12 см. З зелёнай паперы вырабіць тры прамавугольнікі размерамі 5х6 см, 5х4 см, 5х3 см. На прамавугольніках адгінаецца палоска шырынёй 1 см, і да яе робяцца падрэзы. Ненадрэзаныя краі прамавугольнікаў змазваюцца клеем і адзін за адным прыклейваюцца да «ствала» ёлачкі. «Галінкі» злёгку адгінаюцца.

Некалькі такіх рознакаляровых ёлачак упрыгожаць святочны стол (мал. 6).

ЯК БЫЦЬ ПРЫГОЖАЙ

Касметычныя маскі

З бульбы: вялікую бульбіну зварыць у мундзірах, потым пачысціць і размяць, дабавіўшы крыху малака і жаўток яйца. Утвораную кашку падагрэць на паравой ванначцы, потым нанесці на твар і адразу ж накрыць ручніком. Змыць праз 20 хвілін. Маска разагравае, ачышчае і сілкуе скуру твару.

З жытняга хлебнага цеста: накладаецца на 20 хвілін на твар, пасля чаго змываецца цёплай вадой. Яна валодае пажыўным і амаладжальным дзеяннем, утрымлівае вітамін В.

Галівудская маска: дзве сталовыя лыжкі аўсянай ці кукурузнай мукі змяшаць з бялком аднаго яйца да ўтварэння пены. Потым гэтую масу накласці на твар і праз 15—20 хвілін змыць малаком ці вадой. Маска танізуе скуру твару, адбельвае яе і ачышчае.

Жаўточная маска: адзін жаўток разбоўтваецца ў соку палавіны лімона (ці ў кансерваваным лімонным соку) і адной лыжцы алею. Утвораную сумессю змазаць твар, праз 20 хвілін змыць ваткай, намочанай у цёплым малацэ. Маска валодае пажыўным, амаладжальным дзеяннем дзякуючы ўтрыманню лецыціну, халестэрыну і вітамінаў А, B_2 і РР.

З ільнянога семя: дзве лыжкі семя змешваюцца з палавінай шклянкі вады і даводзяцца да кіпення. Потым гэтая кашка ў гарачым выглядзе накладаецца на твар. Маска рассмоктвае зацвярдзенні і ачышчае скуру твару.

Маска з тварагу: 3 лыжкі тварагу змешваюцца з лыжкай смятаны ці мёду, накладаюцца на твар, асабліва каля вачэй і вуснаў. Праз 20 хвілін змыць ваткай, намочанай у малацэ. Маска сілкуе і асвяжае скуру твару.

З агурковай скуркі ці лустачак агурка. Змываецца ваткай, намочанай у малацэ. Маска выдатна адбельвае скуру.

З кіслай капусты: 100 г капусты раўнамерна накласці на твар, праз 20 хвілін змыць халоднай вадой. Маска звужае поры, сілкуе вітамінамі F, С.

РОЗГАДАЕ РОЗГАДАЕ

ПАМІРАЮЦЬ ДЗЕЦІ

36 дзяцей, маленькіх грамадзян Рэспублікі Беларусь, марудна паміраюць, не атрымліваючы неабходнага лячэння ў Мінскім гарадскім анкалагічным дыспансеры. Яны — хворыя на рак шчытападобнай залозы.

Не, ім не патрэбна валюта, не патрэбна лячэнне за мяжой. У Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры пухлін шчытападобнай залозы, якім кіруе прафесар Яўген Дзямідчык, гэтую хваробу лечаць даволі паспяхова. Там ужо прааперыраваны больш як 160 дзяцей з чарнобыльскай зоны, накоплены вялікі вопыт, распрацавана методыка, якая дае хворым другое жыццё.

Але рак шчытападобнай залозы ў дзяцей высокаагрэсіўны, часта суправаджаецца метастазаваннем, таму апрача хірургічнага лячэння патрабуецца лячэнне радыеактыўным ёдам-131. А яго няма.

Раней анкадыспансеру ёд-131 пастаўляла ўсесаюзнае аб'яднанне «Ізатоп». Зараз яго, зразумела, няма, затое створана акцыянернае таварыства «Нуклон». Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» галоўны ўрач дыспансера Віктар Рэбека, за чацвёрты квартал «Нуклону» пералічана 229 тысяч рублёў у якасці палярэдняй аплаты, але ўзаемаразлікі паміж Расіяй і Беларуссю прыпынены, і грошы не дайшлі. Тым не менш, «Нуклон» 10 снежня направіў у Мінск партыю радыеактыўнага ёду, але маскоўскія мытнікі не прапусцілі груз радыефармпрэпаратаў у адрас замежнай дзяржавы без адпаведнай ліцэнзіі на вываз. Ёд-131, перыяд распаду якога складае ўсяго 8 сутак, распаўся. «Нуклон» панёс страты.

Пытанні аб цяжкасцях з пастаўкамі ёду-131 і некаторых іншых прэпаратаў ставіліся перад Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь яшчэ ў верасні, але ніякіх канкрэтных захадаў для паляпшэння сітуацыі зроблена не было. Афармленнем ліцэнзіі на ёд-131 навінен быў заняцца намеснік міністра Аркадзь Канстанцінавіч Томашаў.

Тым часам пяцёра дзяцей, тыдзень прачакаўшы неабходных працэдур, выпісаны з дыспансера.

Калі яны і астатнія хворыя (прычым не толькі дзеці, але і дарослыя) не атрымаюць неабходнага лячэння ў бліжэйшы час, вынікі могуць быць самыя трагічныя. Хто возьме на сябе гэты грэх?

Аляксандр БЯРСУДСКІ.

СЕМІНАР ДОБРАЗЫЧЛІВАСЦІ

Гэтымі днямі ўпершыню ў Беларусі ў Інфармацыйна-культурным цэнтры Савета Міністраў Рэспублікі пачаў сваю работу семінар па арганізацыі эфектыўнай рэкламы і паблік рылейшнз (PR). Яго спадзяюцца арганізатары мерапрыемства (Навукова-даследчая лабараторыя вынаходніцкіх машын і інфармацыйнае агенцтва РІД), семінар стане стартам шырокага і прафесіянальнага пашырэння сувязей грамадскіх і камерцыйных структур, усталявання адносін узаемаразумення і добразычлівасці паміж фірмамі, якія кіруюць друкаванымі органамі і грамадствам у цэлым. Сярод шматлікіх удзельнікаў мерапрыемства — прадстаўнікі «БелАВМ», «Электроніка», «Саміт-сістэмз», супрацоўнікі газет «Рэспубліка», «Звязда», «Знамя юности», «Добры вечар», «Экспресс-реклама».

РІД.

КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА

НАРКАМАНЫ, ТЭРАРЫСТЫ І РАЎНІЎЦЫ

Апошнія дні ў міліцэйскіх зводках адметныя мноствам канфіскаваных гранат. Дзе нашы грамадзяне бяруць нашпігаваныя трацілам жалезныя «фрукты», здагадацца лёгка — са складоў вайсковых часцей. Канкрэтных жа распаўсюджвальнікаў, як гавораць аператыўнікі, шукаюць. І доўга будуць шукаць, пакуль ваенныя не навядуць парадак у сваім ведамстве.

***

У Оршы раней судзімы мясцовы жыхар быў затрыманы ў час вырабу наркатычнага рэчыва разам са сваім напарнікам, у якога такое ж «багатае» мінулае. У час вобыску ў патаемным месцы сышчыкі знайшлі сем гранат Ф-1.

***

На шчасце, толькі да КПП «Каменны Лог» Ашмянскага раёна даехалі на сваёй «сямёрцы» трое хлопцаў з Каўнаса. Акрамя двух гранат Ф-1 і РГД-5 нярпрошаныя госці везлі два аўтаматы Калашнікава, перароблены з вучэбных у баявыя, і 115 патронаў.

***

Некалькі дзён назад у Рагачове раніцай каля будынка ДАІ мясцовага аддзела ўнутраных спраў было ўзарвана неўстаноўленае ўстройства. Пацярпеўшых няма. Пашкоджаны вокны і падаконнік у кабінеце начальніка ДАІ.

***

У Брэсце дыспетчар ваенізаванай аховы ўстроіла сцэну рэўнасці ў кабінеце свайго мужа-дырэктара СП і ўзарвала ручную гранату. Муж і жонка знаходзяцца ў бальніцы.

Віктар ФЕДАРОВІЧ. (БелаПАН).

«АДПУСКНІКІ» З ТУРМЫ

Такога ў практыцы маскоўскіх турмаў яшчэ не было. Чацвёра асуджаных пакінулі тэрыторыю СІЗА № 1 «Матроскай Цішыні» і накіраваліся... у аплачаемы адпачынак тэрмінам на 10 дзён. Адміністрацыя турмы абяцала, што гэта толькі пачатак, падобныя крокі ў адносінах да зняволеных будуць рабіцца і надалей.

(БелаПАН).

ЯК ДЗЮБА З СУВОРАВЫМ СПІРЫТЫЗАВАЎ

У аўторак раніцай посуд на маёй кухні бразнуў і сціх: радыё прапанавала нешта новенькае. Нягледзячы на тое, што на дварэ добра такі ўднела, пачынаўся сеанс радыёспірытызму. Уладзімір Дзюба, чаруючы ля мікрафона, выклікаў дух Аляксандра Васільевіча Суворава. І той з'явіўся. Голасам нашага слыннага дыктара Ілы Кургана пачаў ён агучваць свае ўспаміны пра тое, як у нашых краях нейкіх мяцежнікаў «усмиряял». А патрапаў ён атрады Арэшкі, Навіцкага, Сапегі, Агінскага... Людцы мае, а прозвішчы ж усё наскія, зямляцкія! Аж гарбата абрыдла...

А пан генералісімус пахвальбой сваёй усё поўніць і поўніць эфір: чатыры гадзіны бітвы — «і ўся Літва супакоілася...» Дайшлі рускія войскі да Кракава і Варшавы — на тым «усе польскія хваляванні і скончыліся...»

Прыйдзецца ў двух словах растлумачыць, што гаворка ішла пра часы скону Рэчы Паспалітай, калі Расія прыточвала сабе ад яе ладны беларускі кавалак. Палітычныя інтрыгі Кацярыны II і яе хаўруснікаў еўрапейскіх манархаў суправаджаліся нярэдка справакаванымі бунтамі, вайной шляхецкіх «канфедэрацый». У 1794 годзе, пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай, ідэя выратавання Айчыны натхніла самае масавае паўстанне — паўстанне Касцюшкі.

А вось пасля яго паражэння ўказам Кацярыны II і былі падараваны генерал-фельдмаршалу Суораву Кобрынская воласць і іншае, ды 13.279 душ сялян; а генерал-аншэфу Салтыкову, напрыклад, секвестраванае (адабранае) у Міхала Агінскага мястэчка Ракаў з фальваркамі...

Вось у які час разбіты Суворавым гетман Агінскі піша свой «Паланез». Вось чаму ён называецца «Развітанне з Радзімай».

Але пра ўсё гэта слухач не пачуў. Вядучы сеанса пісьменнік Уладзімір Дзюба, які, дарэчы, даўно і не без поспехаў займаецца гістарычнай тэмай, на гэты раз выцягнуў свайго знакамітага героя з кантэксту гісторыі. І засталася ў ёй адно бліскучая расійская вайсковая слава...

З духамі, што зробіш, не сварацца. Гасцей не ганяць. І прыйшлося спірытуалісту засоўваць так неабачліва выкліканага джына назад у бутэльку прабачэннямі і камплімантамі. Маўляў, Аляксандр Васільевіч, прабачце, хоць і не жадалі вы свабоды нашай Беларусі, але пажадайце што-небудзь нованароджанаму беларускаму войску...

Дык ці варта было дзеля гэтага агарод гарадзіць? Суворай з гонарам паслужыў сваёй Айчыне. І хай спакойна спіць.

А ў нашых хатах хай лепш гучыць мелодыя «Паланеза».

Алена ЦІХАНОВІЧ.

Па нашых слядах?

Ініцыятыўная група па збору подпісаў за рэферэндум па пытанню датэрміновага роспуску цяперашняга складу Вярхоўнай Рады Украіны нядаўна паведаміла, што на 14 снежня было сабрана каля двух мільёнаў подпісаў. За тыдзень да тэрміну завяршэння збору подпісаў яўна не паспеюць сабраць яшчэ адзін мільён да трох патрэбных. Такім чынам, можна сказаць, што лёс рэферэндуму на Украіне прадвызначаны. Яго не будзе, як і ў нас.

Патрэбна Акадэмія мастацтваў Беларусі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

звесці ў адзіны цэнтр вопыт творчасці і мыслення, жывую творчасць пісьменнікаў, мастакоў, архітэктараў, музыкантаў, дзеячаў тэатра і кіно, тэарэтыкаў мастацтва. Толькі акадэмічная структура здольна развіваць фундаментальную культуру і традыцыі ў мастацтве, кіраваць працэсам мастацкай адукацыі. Дзяржаўная культурная палітыка, культурна-асветніцкая і навукова-даследчая дзейнасць будуць мець такім чынам грунтоўны навуковы ўзровень.

У гэтым — адна з гарантый будучыні нашай культуры, рэальная магчымасць захаваць для наступных пакаленняў творчыя традыцыі і ўвесці людзей у свет нацыянальнай спадчыны. Гэта ўмова, без якой немагчыма зберагчы на зямлі шмат непаўторных рысаў беларускай культуры і захоўваць духоўную самастойнасць народа.

Народны паэт Беларусі П. ПАНЧАНКА;
Народны мастак Беларусі і СССР, Акадэмік Расійскай Акадэміі мастацтваў З. АЗГУР;
Народны пісьменнік Беларусі В. БЫКАЎ;
Народны артыст Беларусі і СССР Я. ГЛЕБАЎ;
Народны мастак Беларусі А. КАШКУРЭВІЧ;
Народны мастак Беларусі Л. ШЧАМЯЛЁЎ;
Народная артыстка Беларусі і СССР С. СТАНЮТА;
Народны мастак Беларусі і СССР, Акадэмік Расійскай Акадэміі мастацтваў М. САВІЦКІ;
Народны паэт Беларусі, Акадэмік Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь М. ТАНК;
Народны пісьменнік Беларусі Я. ВРЫ�ль;
Заслужаны архітэктар Беларусі Г. СЫСОЕЎ;
Народны артыст Беларусі і СССР В. ТУРАЎ;
Народны артыст Беларусі і СССР В. ЕЛІЗАРЭЎ;
Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, Акадэмік Расійскай Акадэміі мастацтваў Г. ПАПЛАЎСКІ;
Народны паэт Беларусі Н. ГІЛЕВІЧ.

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб унясенні змянення ў артыкул 8 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прыярытэтным сацыяльна-культурным і эканамічным развіцці сяла і аграпрамысловага комплексу»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Артыкул 8 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прыярытэтным сацыяльна-культурным і эканамічным развіцці сяла і аграпрамысловага комплексу» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 20 (22), арт. 288) выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 8. Ільготы кіраўнікам і спецыялістам сацыяльнай сферы, якія працуюць на сяле.

Кіраўнікам устаноў аховы здароўя, народнай адукацыі, культуры, фізкультуры і спорту, сацыяльнага забеспячэння, размешчаных у сельскай мясцовасці, і спецыялістам, якія працуюць у гэтых установах, устанаўліваюцца павышаныя на 20 працэнтаў службовыя аклады (тарыфныя стаўкі) у параўнанні з аплатай працы адпаведных кіраўнікоў і спецыялістаў, што працуюць у гарадах.

Мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў могуць уводзіцца дадатковыя павышаныя каэфіцыенты да заработнай платы ўказаных работнікаў у залежнасці ад тэрытарыяльнага размяшчэння навучальна-выхаваўчых, медыцынскіх, сацыяльна-культурных устаноў і ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця населеных пунктаў, а таксама можа выкарыстоўвацца кантрактная сістэма найму кіраўнікоў і спецыялістаў».

Гэты Закон увесці ў дзеянне з моманту прыняцця.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

26 лістапада 1992 г. г. Мінск.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні змяненняў у Пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 17 красавіка 1992 года «Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсіённым забеспячэнні»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выкласці пункт 2 Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 17 красавіка 1992 года «Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсіённым забеспячэнні» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 17, арт. 275) у наступнай рэдакцыі:

«Устанавіць, што пенсіі, назначаныя да 1 студзеня 1993 года, па жаданню пенсіянераў могуць быць перараслічаны выходзячы з сярэднямесячнага заработку за любыя 5 гадоў запар з апошніх 15 гадоў работы перад назначэннем пенсіі (артыкулы 56—58, 60) па індывідуальнаму каэфіцыенту заработку, вызначаемаму за адпаведны 5-гадовы перыяд, з прымяненнем артыкула 81 дадзенага Закона».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

9 снежня 1992 г. г. Мінск.

interfax ІНТЕРФАКС

ПАДРАБЯЗНАСЦІ ТРАГЕДЫІ

Паводле ўдакладненых даных, у верталёце, які быў збіты ўвечары 14 снежня ў раёне горада Ткварчэлі ў Абхазіі, загінулі ўсе 56 чалавек, што знаходзіліся на яго борце, у тым ліку 25 дзяцей і 20 жанчын. Аб гэтым паведамілі «Інтэрфаксу» ў міністэрстве абароны Абхазіі. Верталёт перавозіў бежанцаў з акружанага грузінскімі войскамі Ткварчэлі ў Гудауту.

Камісія грузінскіх экспертаў, якая разам з прадстаўнікамі расійскіх ваенных абследавала месца падзення верталёта, прыйшла да высновы, што, акрамя жанчын і дзяцей, на борце верталёта знаходзіліся да 20 абхазскіх і паўночнакаўказскіх «баевікоў», а таксама шмат зброі і ўзрыўчаткі, частка якой захавалася.

Старшыня Вярхоўнага Савета Абхазіі Уладзіслаў Ардзінба накіраваў у аўторан на імя міністра абароны Расіі Паўла Грачова тэлеграму спачування членам сем'яў загінуўшых расійскіх лётчыкаў. Гэтым сем'ям, згодна з тэлеграмай, кіраўніцтва Абхазіі выдзеліць па 100 тыс. рублёў.

Кіраўнік Грузіі Эдуард Шэварднадзе таксама накіраваў спачуванні сем'ям загінуўшых «у выніку безадказных дзеянняў прадстаўнікоў Расіі»

УКАЗЫ АБ ПРЭМ'ЕРАХ

Прэзідэнт РФ Барыс Ельцын падпісаў указ аб вызваленні Ягора Гайдара ад абавязкаў першага намесніка старшыні Ўрада, выконваючага абавязкі прэм'ера. Пра гэта паведаміла ў чацвер прэс-служба прэзідэнта.

Другім указам прэзідэнта Я. Гайдар зацверджаны на пасадзе дырэктара Інстытута эканамічных праблем пераходнага перыяду. Адначасова Я. Гайдар будзе кансультантам прэзідэнта РФ па пытаннях эканамічнай палітыкі.

Фільмы тыдня

- **ВІТТ: ФЕСТЫВАЛЬ «ФІРМЕННАГА» КІНО. «І МАЙСТЭРСТВА, І НАТХНЕННЕ»**
- **«САДЫ СКАРПІЁНА»**
- **«ДРАПЕЖНІКІ»**
- **«У КОЖНАГА СВАЕ НЕДАХОПЫ»**

У АПОШНІ ЧАС акцыянернае таварыства «Навукова-вытворчая кампанія ВІТТ», якім кіруе вядомы беларускі прадпрымальнік Валерый Мацулевіч, заняло прыкметнае месца ў дзелавым і культурным жыцці нашай рэспублікі. Аўтарытэт і павагу гэтай фірме прынеслі не толькі паспяховая камерцыйная дзейнасць, але і імкненне падтрымаць беларускую культуру, і кінематограф у прыватнасці. АТ «ВІТТ» мае сваю студыю мастацкіх фільмаў, якая за паўтара года паспела выпусціць шэраг арыгінальных, цікавых кінанарцін. І вось цяпер адзін з лідэраў маладога беларускага бізнесу — акцыянернае таварыства «ВІТТ» арганізуе свой першы фестываль уласных мастацкіх фільмаў, які пачнецца 18 снежня ў сталічным Тэатры-студыі кінаакцёра (кінатэатр «Масква»).

Усе кінастудыі, якія прадстаўлены ў праграме фестывалю, адметныя як у жанравых, так і ў прафесіянальных адносінах. Гледачы з задавальненнем паглядзяць каляровую мастацкую кінастужку «Сонечны дзень у канцы лета» — гісторыю светлага кахання, яное нечакана ўзнікла паміж двума сталымі людзьмі. Усяго адзін дзень пабылі героі разам, але гэты дзень такі значны ў іх лёсе...

Поспех карціне, несумненна, забяспечвае ўдзел у ёй таленавітых кінаакцёраў — Наталлі Сайко і Валерыя Прыёмыхава. Сцэнарый напісалі С. Арцімовіч і А. Тарасава, а паставіў фільм рэжысёр С. Арцімовіч.

Не забыты творчым калектывам «ВІТТ» і аматары вострапрыгодніцкіх фільмаў. Менавіта для іх прызначаны напружаныя дэтэктыўныя стужкі «Чортавы лялькі» (аўтары сцэнарыя — Д. Іваноў і У. Трыфанаў, рэжысёр — Ю. Рыбчонак) і «Уікэнд з забойцам» (пастаноўка Ю. Марухіна па сцэнарыю тых жа аўтараў). А завершыць праграму фестывалю хвалюючая меладраматычная кінакарціна «Палёт начнога матылька», прэм'ера якой адбудзецца 20 снежня ў вялікай зале кінатэатра «Масква». Гэты захапляючы фільм, пастаўлены рэжысёрам Ю. Баржыцкім па сцэнарыю Д. Іванова і У. Трыфанава, апавядае пра гісторыю страснага кахання амерыканскага піяніста Роберта і нашага айчыннага «начнога матылька» Алены, якая імкнецца вырвацца з павуціння пошласці і распусты, у якім калісьці заблыталася...

СТАРЫЯ КАДРЫ КІНАХРОНІКІ. Вось замежныя госці, якія, нарэшце, без страху прыехалі ў Маскву на розныя фестывалі і тыдні. Іў Мантан, Джульета Мазіна, Соня Калера. Урывак з «Начэй Кабірыі» — фільма, які ўсхваляваў налісьці ўсю краіну. Вось і зоркі эстрады тых гадоў — славутыя Штэпсель і Тарапунька... Так, гэтым жыла моладзь эпохі «адлігі». Мільгаюць кадры кінахронікі — мора кветак і шчырых усмешак... Гэта і яшчэ шмат што гледачы ўбачаць, паглядзеўшы каляровую мастацкую кінастужку «САДЫ СКАРПІЁНА», створаную кінематаграфістамі Кінастудыі першага і эксперыментальнага фільма кінаканцэрна «Ленфільм». Гэта першая рэжысёрская і драматургічная работа кіназнаўцы Алега Кавалава. Карціна ўяўляе сабой калаж, нейкае счапленне фрагментаў кінафільмаў 50-х гадоў, зведзеных у адно аўтарскай рукой. Дзеянне разгортваецца хутчэй па законах музычнай, чым літаратурнай драматургіі.

Перад гледачамі на экране паўстае свет, прасякнуты глыбока асабістымі адносінамі мастака, адначасова іранічнымі і шчымліва-настальгічнымі.

СТУДЫЯ «ТВОРЧАСЦЬ» і Выдатбанк перадаюць на суд гледачоў новую каляровую мастацкую кінастужку «ДРАПЕЖНІКІ». Аўтары сцэнарыя — Анатоль Бязуглаў і Аляксандр Косараў, рэжысёр-пастаноўшчык — Аляксандр Косараў. У сабалёным запаведніку ў Сібіры выстралам з ружжа забіты вучоны з Масквы, спецыяліст па пушніне Аўдонін. На месца здарэння вылятае група крымінаністаў, якую ўзначальвае следчы абласной пра-

куратуры Дагурава. Пад падазрэнне трапляе малады лясніч Ніл Асятроў, які поўнасцю адмаўляе сваю віну. На допыце ён прызнаецца, што чалавека, сустрэтага ім у тайзе, палічыў браканьерам і зрабіў папераджальны страл уверх, а вось той, сапраўды, спрабаваў яго забіць. Неўзабаве і крымінаністы даюць заключэнне, што Аўдонін быў застрэлены не з карабіна Асятрова. Следства зайшло б у тупік, каб міліцыя выпадкова не затрымала біча па мянушцы Флейта...

У галоўных ролях заняты Ірына Караткова, Пётр Вельямінаў, Ігар Волкаў, Ігар Кваша.

АМЕРЫКАНСКІМІ КІНАМАЙСТРАМІ створана каляровая мастацкая кінастужка «У КОЖНАГА СВАЕ НЕДАХОПЫ». Сцэнарый яе напісалі Джаст Бетцэр і Бені Корцэн, рэжысёр — Роберт Кейлар. Назвай карціне паслужыла фінальная фраза з легендарнай камедыі Білі Уайлдэра «У джазе толькі дзяўчаты».

...Сцію Даркер закахаўся ў асляпляльную бландзінку Шэлі, якая віртуозна гуляе ў тэніс. Прадпрымальны Эндзі, сябар Сціва, назіраючы пакуты хлопца, прапануе яму пераапрануцца жанчынай і пасябраваць з Шэлі. Сцію неахвотна згаджаецца, але потым уваходзіць у ролю.

НА ЗДЫМКУ: кадр з фільма «Палёт начнога матылька». Алена — артыстка Ганна Ціханава.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Збіраючыся за мяжу, штудзіруйце атласы. І геаграфічныя, і гістарычныя

Першыя атрыбуты прыналежнасці да беларускага грамадзянства хутчэй за ўсё з'явяцца ўжо ў пачатку новага года. Імі стануць адпаведныя штампы ў замежных пашпартах тых, хто намерыцца выехаць за рубеж. Пра гэта стала вядома ўчора ад намесніка міністра замежных спраў Уладзіміра Астапенкі ў час прэс-канферэнцыі ў МЗС. Перспектывы ўласнага беларускага пашпарта дагэтуль застаюцца цьмянымі — ні пра тэрміны іх з'яўлення, ні пра краіну, дзе яны будуць друкавацца, намеснік міністра не паведаміў.

Уладзімір Астапенка толькі што вярнуўся з Варшавы, дзе абмяркоўваў з польскімі калегамі праблемы ўзаемных бязвізавых паездак грамадзян абедзвюх краін. Перагаворы і кансультацыі былі паспяховымі. Нас чакаюць значна палегчаны рэжым паездак у Польшчу і новыя пагранічныя пераходы.

Такія ж перагаворы вяліся і з Кітаем. Праўда, адпраўляцца без візаў туды змогуць пакуль толькі ўладальнікі службовых і дыпламатычных пашпартоў. Гандлярам «пухавікамі», якія не здолеюць здабыць сабе «сініх» пашпартоў, будзе больш складана. Зрэшты, турысцкім групам уезд у Кітай таксама будзе спрошчаны.

Аказалася, што з сярэдзіны снежня пачало дзейнічаць заключанае паміж некаторымі краінамі СНД пагадненне аб узаемным прызнанні візаў. Для прыкладу, як растлумачыў намеснік міністра, калі вы з Уладзівастока хочаце дабрацца да Беларусі праз Казахстан, Таджыкістан ці Кыргызстан, маючы беларускую візу, то — калі ласка, ніякіх транзітных візаў не трэба. Словам, беларусам адкрыты шлях на Усход, а грамадзянам Расіі і Сярэдняй Азіі — на Захад праз бязвізавыя беларускія вароты. Паколькі Украіна (як і Малдова, Азербайджан, Туркменістан) адпаведнае пагадненне не заключыла, то ў нашых варотах, напэўна, будзе цесна. Не ведаю, ці шмат беларусаў збіраюцца адкрываць для сябе Індыю, Пакістан і іншыя экзатычныя краіны, а вось тое, што патокі расіян адназначна аддаюць перавагу заходняму накірунку, — дакладна. Каму ў такім кантэксце больш выгадна заключанае пагадненне, — з прэс-канферэнцыі зразумелым не стала.

Пасольствы заходніх краін пакуль што не афармляюць візы ў Мінску. Па словах Астапенкі, гэта тлумачыцца тэхнічнымі ўмовамі, адсутнасцю пастаянных рэзідэнцый паслоў і г. д.

Нашы пасольствы за мяжой таксама будуць адкрывацца зусім не такімі шпаркімі тэмпамі, як меркавалася раней. Няма валюты, не вырашаны спрэчкі аб маёмасці былога Саюза, патрэбны вялікія капітальныя ўкладанні.

На пытанне, ці мяркуе наша знешнепалітычнае ведамства весці перагаворы аб расшырэнні пераліку краін, для ўезду ў якія не будуць патрэбны візы, Уладзімір Астапенка адказаў станоўча. І назваў некаторыя краіны былога сацлагера — Балгарыю, Румынію, Чэха-Славакію.

Напэўна, агульнае камуністычнае мінулае яшчэ доўга будзе трымаць нас у арбіце былога лагера, вызначаючы па інерцыі прыярытэты, цяжка вытлумачальныя з пункту гледжання цвярозага сэнсу. Інакш як растлумачыць, што «бязвізавы» Кітай, да якога — паўсутак самалётам, аказваецца для нас намнога больш даступным, чым цывілізаваная Германія, да якой — некалькі гадзін цягніком.

Валянцін ЖДАНКО.

Догляд за халадзільнікам

Халадзільнік нельга ставіць блізка ад батарэй цэнтральнага ацяплення і прысоўваць ўшчыльную да сцяны, таму што кандэнсатару патрэбны свабодны прыток паветра. Мыць яго рэкамендуецца не радзей аднаго раза ў месяц, папярэдне адключыўшы ад сеткі. Размарозіць выпаральнік, зліць ваду. Нельга паскараць адтайванне: ставіць у маразілку кіпяток, саскрабаць лёд ножом — гэтым можна папсаваць халадзільнік. Унутраную камеру халадзільніка мыюць цёплым содавым растворам. А вось алюміневаму выпаральніку сода проціпаказана. Яго, як і іншыя алюміневыя дэталі, проста праціраюць. Трэба сачыць, каб вада не збіралася на дне камеры. Яна можа пашкодзіць ізаляцыю. Чысты халадзільнік трэба праветрыць, пакінуўшы дзверцы адкрытымі.

У час прыбірання кватэры трэба ачысціць кандэнсатар халадзільніка (рабрыстае прыстасаванне на задняй сценцы) ад пылу. Зрабіць гэта можна пыласосам ці шчоткай.

На дно маразілкі рэкамендуецца пакласці поліэтыленавую плёнку ці рашотку, каб скруткі не прымярзалі. Інакш можна пашкодзіць выпаральнік.

Калі халадзільнік страціў знешні выгляд, у хатніх умовах няцяжка аднавіць белае

пакрыццё. Для гэтага падрапаную паверхню зачышчаюць наждачнай паперай, праціраюць бензінам і, калі няма аголеных да металу месц, адразу наносяць белую эмаль. Аголены метал трэба спачатку загрунтаваць да ўтварэння роўнага поля нітрашпаклёўкай, даць ён прасохнуць, зачысціць наждаком, пацерці бензінам і толькі пасля гэтага пакрыць паверхню эмаллю. І грунт, і эмаль наносяць тонкім слоем. Для афарбоўкі рэкамендуецца мяккі пэндзаль. Эмалі трэба браць фармальдэгідныя.

Аднавіць першапачатковы бляск паверхні халадзільніка, пральнай машыны, іншых прадметаў дапаможа састаў, які рыхтуецца з 50 г зубнога парашку і 20—25 г нашатырнага спірту. У ім трэба намачыць газетную паперу і старанна працерці паверхню.

Некаторыя халадзільнікі пафарбаваны спосабам гарачага эмалявання. У хатніх умовах аднавіць такую паверхню нельга.

Калі на ўнутранай панелі дзверцаў халадзільніка з'явіліся трэшчыны, іх замазваюць клеем для полістыролу. Тонкія трэшчыны зацiраюць пальцам, а на вялікія накладваюць латку з тканіны, насычанай клеем у 2—3 слаі. Затым латку прыгладжваюць і зацiраюць.

Пры працяглым адключэнні халадзільніка, напрыклад, на зіму, дзверцы яго не трэба закрываць шчыльна.

Калі ў халадзільніку з'явіўся пах, дастаткова раскласці па паліцах кавалачкі хлеба. Хлеб трэба патрымаць у закрытым халадзільніку некалькі гадзін — пах знікне.

Выпускаюцца і спецыяльныя прэпараты, якія выдаляюць непрыемныя пахі з халадзільніка.

Карысныя дробязі

● Маленькія дзеці, здараецца, сунуць у разеткі пальцы і трапляюць пад ток. Каб пазбегнуць гэтага, разеткі абсталёўваюцца ахоўным дыскам з ізаляцыйнага матэрыялу; калі прыборы выключаны, адтуліну дыска змяшчаюць убок адносна гнёздаў разеткі.

● З лыж, рэек і кавалка шчыльнай тканіны лёгка зрабіць складныя санкі.

● Дзеці, падрастаючы, рызыкуюць вываліцца з каляскі. Калі абсталяваць каляску лёгкімі парэнчамі з алюміневай трубкі, то гэтай небяспекі можна пазбегнуць.

● Каб школьнік правільна сядзеў за сталом, даводзіцца іншы раз падкладваць на стул падушкі, кнігі і г. д. Павялічыць вышыню стула можна, нарасціўшы яго ножкі. Драўляныя ўстаўкі ўкладваюцца ў адрэзкі таўстасценнага гумавага шланга, якія надзяваюцца на ножкі стула. З часам устаўкі памяншаюцца.

● Дзіцяці падабаецца купацца... пакуль у вочы не трапіла мыла. І адразу плач, ніякія ўгаворы не дапамагаюць. Выражце круг з гумы, напрыклад, са старой грэлкі, зрабіце пасярэдзіне адтуліну, каб праходзіла галава. З палёў такога «капелюша» мыльная вада будзе сцякаць, не трапляючы ў вочы дзіцяці.

ВАША ЗДАРОЎЕ

Ударылі кісць ці пальцы

Удары — гэта розныя пашкоджанні тканак, якія не суправаджаюцца парушэннем цэласнасці скуры. Да 70 працэнтаў удараў належыць да лёгкіх, ці міхратраўмаў, 25 — да ўдараў сярэдняй цяжкасці і 5 — да цяжкіх. Часцей пашкоджваюцца пальцы (60,2), радзей — кісць і запясце (39,8 працэнта).

Прыкметы: боль у месцы ўдару, нарастаючы ацёк у выніку крывазліцця ў мясцовыя тканкі, абмежаванне рухаў у суставах.

Аказанне дапамогі: ахаладжэнне месца ўдару струменем халоднай вады з-пад крана да анямення скуры. Паўтараць да таго часу, пакуль не сціхне боль і не адновяцца рухі.

Пацярпеўшым з лёгкімі ўдарамі звычайна дастаткова 2—3 перарывістых ахаладжэнняў. Павязка не накладаецца. Пасля аказання першай дапамогі многія (каля 80 працэнтаў) могуць працягваць работу.

Калі ж боль пасля ахаладжэння не сціхае, рухі пальцаў і кісці абмежаваныя, балючыя, неабходна неадкладна звярнуцца за дапамогай да хірурга.

Уладзімір ДАЛГОЛІКАЎ, дацэнт.

г. Мінск.

ДАЎРАЧЭБНАЯ ДАПАМОГА

Стомленасць

Яна выклікаецца інтэнсіўнай ці працяглай работай. Праяўляецца зніжэннем працаздольнасці і адчуваннем млявасці.

У выніку празмернай аднаразовай ці працяглай (тыдні і месяцы) стомленасці ад разумовай або фізічнай працы часта развіваецца ператамленне. Гэты, стан мяжуе з хваробай і можа завяршыцца развіццём неўрастэнічнага сіндрому.

Стомленасць дзяцей выклікаецца хранічным недасыпаннем, няправільнай арганізацыяй дня, цяжкасцю выконваемых заданняў, працяглымі праглядамі тэлеперадач. Хваробе садзейнічае працяглае чытанне, манатонныя заняткі, абмежаванне рухальнай актыўнасці.

У дзяцей стомленасць праяўляецца ўжо з 2—3 гадоў жыцця ў рэзкім змяненні паводзін: малышы становяцца раздражнёнымі, упартымі, часам агрэсіўнымі, у іх знікае апетыт, парушаецца сон. У дзяцей старэйшых, за 4 гады прыкметна зніжаецца канцэнтрацыя ўвагі, парушаецца кардынацыя рухаў, з'яўляецца плаксівасць.

У малодшых школьнікаў усё гэта не так прыкметна. Але яны пачынаюць часцей рабіць памылкі, у іх парушаюцца сон, апетыт, пагаршаецца ўспрыманне і запамінанне вучэбнага матэрыялу, расце раздражнёнасць.

АКАЗАННЕ ДАПАМОГІ. Калі вы адчулі моцную стомленасць у час разумовай (сядзячай) работы, выйдзіце з пакоя, падыхайце свежым паветрам. Прайдзіцеся па калідоры ці падыміцеся на лесвіцы, знайдзіце месца, дзе можна добра пацягнуцца; абапёршыся рукамі аб дзверы ці сцяну, выгнуць спіну (як кошка). Карысна выканаць фізічныя практыкаванні для шыі і для пяясніцы — энергічныя нахілы, павароты.

Памасіруйце сабе надпераноссе, надброўі, скроні, патыліцу і шыю, страсяніце некалькі разоў кісцямі рук. Дапамагаюць зняць стомленасць кубак кавы ці чаю з мёдам, добрая музыка, анекдоты, жарты, аўтагенныя практыкаванні. Аднак доўга адпачываць не трэба, таму што потым цяжка ўвайсці ў рабочы рытм.

У выпадку з'яўлення стомленасці каля станка ці канвеера, ад якога нельга адысціся, абавязкова змяніце позу, памасіруйце шыю і патыліцу, страсяніце некалькі разоў кісцямі рук. Але ні ў якім разе не курыце. Гэта вельмі шкодна, таму што ўзмацняецца кіслароднае галаданне мозгу і звужаюцца сасуды ног, рук, сэрца, прытупляецца мысленне, зніжаецца канцэнтрацыя ўвагі.

Пасля работы ў полі, на дачы часта ўдаецца зняць стомленасць гарачым абедам з танізуючымі напіткамі тыпу «Тархун», «Саяны», «Пепсі-кола», кавай, сокамі.

Калі ў час работы вам даводзіцца шмат стаяць ці хадзіць, дома адразу памыйце ногі гарачай вадой.

Прыладкуйцеся на канапе з прыўзнятымі нагамі на 10—15 хвілін.

Нядрэнна прыняць цёплы душ ці ванну, зрабіць комплекс падабраных фізічных практыкаванняў, з'есці смачную яду, паслухаць любімую музыку, заняцца самарэгуляцыяй, нарэшце — выспацца.

Маленькіх дзяцей, якія пры стомленасці становяцца капрызнымі, трэба (калі ўдасца) накармі

ПРАГРАМА ТЭЛЕ-ПЕРАДАЧ

21 снежня, ПАНЯДЗЕЛАК

Беларускае тэлебачанне

16.30. «У імя ўваскрэсення». Дак. фільм.
16.40. Гісторыя Беларусі. 5 клас.
17.00. Адкрыты кубак Беларусі па боксу.
18.00. Каралеўскае паляванне.
19.00. Абласныя навіны (Брэст).
19.10. Гарачая справа. Чаму лічаманіць беларускую металургію?
19.40. Здароўе. Хто вы, доктар Сайкоў?
20.05. Творчае аб'яднанне МЭТА.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. «Рыцары неба». Маст. фільм. 15-я серыя.
22.05. «Мастацтва і палёт». Рэжысёр Віктар Карпілаў.
23.20. Спартыўны тэлекур'ер.
23.45. НІКа.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Паглядзі, паслухай...»
8.40. Што? Дзе? Калі?
9.45. Новае паналенне выбірае.
10.35. Мультфільмы «Блакітны мяч», «Я малюю чырвоны лес».
11.00. Навіны з (сурдаперакладам).
14.00. Навіны з (сурдаперакладам).
14.20. Тэлемікст.
15.10. «Чараўнік Ізумруднага горада». Мультфільм.
15.50. Асацыяцыя дзіцячага тэлебачання. «Квецік-сямікветцік».
16.15. Зорная гадзіна.
17.00. Навіны.
17.25. Хакей. Міжнародны турнір на прыз газеты «Известия». У перапынках — Футбольны агляд і «Добрай ночы, малышы!»
20.00. Навіны.
20.40. «Дробязі жыцця». 12-я серыя.
21.10. Бамонд.
21.25. Аднак.
21.40. Барыс Майсеў і яго лэдзі. Эстраднае шоў.
23.00. Навіны.
23.20. Джэм-сейшн.
0.00. «Імперыя». Маст. фільм. 4-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Зусім сакратна.
8.50. «Падполле. Інтэлігенты 70-х. Іх шлях да Бога».
11.00. «Жанчына ў капелюшы». Маст. фільм.
12.30. Мульці-пульці.
12.35. Гандлёвы дом «Т. Ін. Ка».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Вучыцца рынку.
15.30. Вуснамі дзіцяці.
16.00. Там-там навіны.
16.15. «Адлюстраванне».
17.00. Гутаркі ў «Метраполі».
17.20. Давайце разбяромся.
17.35. Настальгічныя вячоркі.
18.05. Спявае Віка Цыганова.
18.15. СІ-бі-эс на Расійскім тэлебачанні.
18.25. «Казка казак». Мультфільм.
19.00. Весткі.
19.25. «Лепшыя паліцэйскія». Маст. фільм.
20.25. «Дом шпіёнаў». Дак. фільм.
20.55. «60 мінут». СІ-бі-эс.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.40. Сёння ў ВС Расіі.
22.55. «Анёлам крануты». У. Набокаў.
23.40. Экзотыка.

22 снежня, АЎТОРАК

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Хохлаўка». Кінанарыс.
9.00. Гісторыя Беларусі. 5 клас.
9.20. «Рыцары неба». Маст. фільм. 13-я серыя.
9.50. «Арлан-белахвост Эстоніі», «Пецярбург Андрэя Белага». Дак. фільмы.
10.30. «Поезд у Галівуд». Маст. фільм.
16.30. Беларуская літаратура. 9 клас.
17.00. Фільм-канцэрт.
17.20. «Малыш і Карлсан». Мультфільм.
18.00. Дак. фільм «Маята».
18.30. Мемарыял Я. Новікава па цяжкай атлетыцы.
19.00. Абласныя навіны (Віцебск).
19.10. Эканамічная хваля. «Каму сарока кашу варыла?» Праблемы дзіцячага харчавання. Прамая лінія.
20.10. «Тэра-92». Роздум пасля I Міжнароднага сельскагаспадарчага кірмашу ў Горках.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.40. «Рыцары неба». Маст. фільм. 16-я серыя.
22.10. НІКа.
22.25. «Сіртакі». Маст. фільм (Грэцыя).
0.00. Беларускія музычныя весткі.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.25. «Імперыя». Маст. фільм. 4-я серыя.
9.15. Асацыяцыя дзіцячага тэлебачання.
9.40. У свеце жывёл (з сурдаперакладам).
10.30. «Дробязі жыцця». 12-я серыя.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Багатыя кварталы». Маст. фільм (Францыя). 1-я серыя.
12.45. «Лета ката Леапольда». Мультфільм.
12.55. «Цётка Маруся». Маст. фільм. 1-я серыя.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Дзелавы веснік.
14.40. Свет грошай Адама Сміта.
15.10. Блакнот.
15.15. «Чараўнік Ізумруднага горада». Мультфільм. 3-я і 4-я серыі.
15.50. «Алтай. Поры года».
16.00. «440 герц».
16.45. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. «Астанкіна» прадстаўляе...
18.00. «Вяртанне ў Эдэм». Маст. фільм.
18.45. Мініяцюра.
18.55. Тэма.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «Пустыня». 1-я серыя.
21.45. Ваеннае рэвю.
22.15. «Пазнаеш, хто я такі?»
22.25. Каханне з першага позірку. У перапынку (23.00) — Навіны.
23.55. «Імперыя». Маст. фільм. 5-я серыя.
0.45. «Жыла-была мара». Фільм-канцэрт.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Момант ісціны. На пытанні Андрэя Каравулава адказвае Арцём Тарасаў.
8.50. Вольны час. «Сябры нашы, кошкі».
11.00. «Штэмп». Маст. фільм.
12.35. «Т. Ін. Ка».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Студыя «Рост». «Кенгуру».
16.00. Там-там навіны.
16.15. Урал-ТВ.
17.00. «Цела — храм душы». Школа выжывання.
17.20. Парламенцкі веснік.
17.35. Адзін дзень цяжкага дваpа.
18.15. Спявае Ігар Крастоўскі.
18.25. «Прыгоды Эн і Эндзі». Мультфільм.
19.00. Весткі.
19.20. Рэклама.
19.25. «Сапраўдныя дэтэктывы». Маст. фільм.
20.25. «Няма дзе схавацца». Фільм тэлевізійнага цыкла «Шпіёны». (СІ-бі-эс).
20.55. «Выратаванне 911».
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.40. На сесіі ВС Расіі.
23.10. Баль Эдзіты П'ехі.

23 снежня, СЕРАДА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Сем азёраў». Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 9 клас.
9.30. «Рыцары неба». Маст. фільм. 14-я серыя.
10.00. Дак. фільмы «І расказала возера», «Талінскі заапарк».
11.00. «Аварыя» — дачка мента». Маст. фільм.
16.35. Фільм — дзецям. «Лапландскія казкі».
17.50. «Правіцель Турапута». Мультфільм.
18.00. Праблемы канверсіі на Брэсцкім радыётэхнічным заводзе.
18.30. Дак. фільм «Вогненныя пацеркі».
19.00. Абласныя навіны (Гомель).
19.15. Прафсаюзы: праблемы, каментарыі.
19.50. Якія мы гаспадары? Харчовыя прадпрыемствы Слуцка.
20.15. Фрэска. Фільм-канцэрт.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Рыцары неба». Маст. фільм. 17-я серыя.
22.05. НІКа.
22.20. «Аварыя» — дачка мента». Маст. фільм.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Імперыя». Маст. фільм. 5-я серыя.
9.10. «440 герц».
9.50. «Па святых мясцінах...» Чарнігаўскі скіт.
10.50. «Звычайныя небяспечныя прыгоды». Мультфільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Багатыя кварталы». Маст. фільм (Францыя). 2-я серыя.
12.40. «А ў цябе ёсць сонца?» Мультфільм.
12.55. «Цётка Маруся». Маст. фільм. 2-я серыя.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.15. «Чараўнік Ізумруднага горада». Мультфільм. 5-я і 6-я серыі.
15.55. «Настасся». Дак. фільм.
16.05. Шмат музыкі.
16.45. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. «Цыпло душы тваёй» (Мінск).
18.00. Маст. фільм «Вяртанне ў Эдэм».
18.50. Студыя «Палітыка» паказвае.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «Пустыня». 2-я серыя.
21.55. Чорная скрыня.
22.25. «Аўтасалон-92» у Маскве. У перапынку (23.00) — Навіны.
0.00. «Імперыя». Маст. фільм. 6-я серыя.
0.50. «Джаз у кішэні».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
8.00. «Сола ў Кёльне». Леў Копелеў.
8.30. Фарс-мажор.
11.00. «Рабочы пасёлак». Маст. фільм. 1-я серыя.
12.05. Настальгічныя вячоркі.
12.35. «Т. Ін. Ка».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Сігнал.
15.15. Акно.
15.45. Ваш прыватызацыйны чэк.
16.05. Там-там навіны.
16.20. Далёкі Усход.
17.05. Хрысціянская праграма.
17.35. Апазіцыя.
18.15. Мульці-пульці. «Я вярнуся да цябе дажджом».
18.25. «Хэнк — вартавы сабака». Мультфільм.
19.00. Весткі.
19.25. «Воўк». Маст. фільм.
21.15. Крымінальныя паведамленні.
21.25. «Халодныя ўраўненні».
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.40. На сесіі ВС Расіі.
23.10. «Выратаванне 911».

24 снежня, ЧАЦВЕР

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Рыцары неба». Маст. фільм. 15-я серыя.
9.15. «Азоўская мора». Дак. фільм.
10.05. «Крымінальны квартэт». Маст. фільм.
16.20. Фільм — дзецям. «Тры таўстуны».
17.50. Чарнобыль: праблемы і вырашэнні. Перадача з Гомеля.
18.20. Бізнесклуб «Партнёр». Маладзечна і яго жыхары.
18.50. Тэлевізійная дошка аб'яў.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.20. Як пачаць уласную справу? Дылог амерыканскіх бізнесменаў.
19.55. Тыдзень Беларускага ўрада. Інтэрв'ю Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. Ф. Кебіча.
20.30. Беларускія калядны.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Справа выпадку. Латарэя ўдачы.
21.40. Беларускія калядны.
21.55. Творчае маладзёжнае аб'яднанне «Крок» прадстаўляе... Студыя «Формула».
23.25. НІКа.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Імперыя». Маст. фільм. 6-я серыя.
9.10. Мультфільмы «Навагодні вечар», «Травяная пастачка».
9.40. Лірычны канцэрт.
10.00. «Казакі-казачэнькі».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Багатыя кварталы». Маст. фільм (Францыя). 3-я серыя.
12.55. «Валодзя вялікі, Валодзя малы». Маст. фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Тэлемікст.
15.10. «Чараўнік Ізумруднага горада». 7-я і 8-я серыі.
15.45. Духоўная ежа.
16.05. Алеся і кампанія.
16.45. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.20. ...Да 16 і старэйшым.
18.00. Маст. фільм «Вяртанне ў Эдэм».
18.50. Канцэрт з твораў Р. Паўлса.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Лато «Мільён».
21.10. Да і пасля поўначы. У перапынку (23.00) — Навіны.
23.50. «Каралеўскае вяселле». Маст. фільм (ЗША).

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Караван. Тэлеальманах.
8.50. Вольны час. «Пад знакам Рыбы».
9.05. Тэма з варыяцыямі. «Аве Марыя».
11.00. «Рабочы пасёлак». Маст. фільм. 2-я серыя.
12.05. «Бурда модэн» прапануе...
12.35. «Т. Ін. Ка».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Упершыню ў Расіі.
15.30. Студыя «Рост». «Дазвольце запрасіць».
16.00. Там-там навіны.
16.15. Навагодні пірог.
16.25. Мульці-пульці. «Страшыдла».
16.35. Да Масквы далёка.
17.20. Так і жывём.
17.50. Парламенцкі веснік.
18.05. Спецыяльны камерцыйны веснік.
18.15. Мульці-пульці. «Шлёп, чмяк, бразь».
18.25. «Кэтс і сабака». Тэлефільм для дзяцей.
19.00. Весткі.
19.25. «Вячэрні цень».
20.25. У свеце аўта- і мотаспорту.
20.55. «48 гадзін». (СІ-бі-эс).
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.40. На сесіі ВС Расіі.
23.10. Публіцыстычная праграма.

25 снежня, ПЯТНІЦА

Беларускае тэлебачанне

9.00. Беларускія калядны. Святочная праграма студыі «Тэлесябрына».
12.30 Навіны.
12.50 Працяг святочнай праграмы.
15.00. Сем колераў радасці.
15.30. «Калядныя казні». Фільм —дзецям.
16.45. Ленасць. Духоўна-рэлігійная праграма.
17.30. Навіны.
17.50. «Маленне пра чашу». Дак. фільм.
18.20. «Вяртанне блукаючай зоркі». Мікола Гусоўскі і яго паэма «Песня пра зубра».
18.45. «Авяліта, не чапляйся да мужчын!» Маст. фільм.
20.10. Дак. фільм
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Рыцары неба». Маст. фільм. 18-я серыя.
22.05. «Песню бярыце з сабою». Часткі 1-я і 2-я.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. Мультфільмы «Калі запальваюцца ёлкі», «У лесе нарадзілася ёлачка».
8.45. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
9.35. Канцэрт Э. Грача і яго вучняў.
10.20. ...Да 16 і старэйшым.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Гэта цудоўнае жыццё». Маст. фільм (ЗША).
13.30. «Прыгоды Стынгрэй». Маст. фільм.
13.40. «Мартышка і смык». Мультфільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Брыдж.
14.45. Бізнес-клас.
15.05. «Чараўнік Ізумруднага горада». 9-я і 10-я серыі.
15.40. І.-С. Бах. «Брандэнбургскі канцэрт».
15.55. Цэнтр.
16.35. Тэхнадром.
16.45. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. Эканамічны клуб.
18.25. Чалавек і закон.
18.50. Поле цудаў.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «Эратычнае шоў» (Венгрыя).
21.35. ВІД прадстаўляе. Палітбюро.
22.05. Музагляд.
22.45. Чалавек тыдня.
23.00. Навіны.
23.20. Аўта-шоў.
23.40. Пляцоўка агляду.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Вольны час. «Тэлебудсервіс».
10.00. Лепшыя гульні НБА.
11.00. «Гіпербалоід інжынера Гарына». Маст. фільм.
12.35. Гандлёвы дом «Т. Ін. Ка.»
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Студыя «Рост». Тон-лабірынт.
16.00. Там-там навіны.
16.15. Навагодні пірог.
16.25. Мінарэт.
16.40. Кіпрас Мажэйка. Рэпартажы з НАТО.
17.10. М-трэст.
17.25. Уолт Дысней па пятніцах. «Калядная зорка». 1-я серыя.
18.15. Мульці-пульці. «Дым».
18.25. «Каляды кожны дзень». Мультфільм.
19.00. Весткі.
19.25. «Апошні з апачаў». Маст. фільм.
21.15. Крымінальныя паведамленні.
21.25. «Куфар». Маст. фільм.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.40. На сесіі ВС Расіі.
23.10. «Пачвара з Візамберга». Маст. фільм.

26 снежня, СУБОТА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Звычайны дзень». Кінанарыс.
8.55. «Скандальнае здарэнне ў Брыкмілі». Маст. фільм. 1-я серыя.
10.00. Паказвае Гродна. Пераднавагодняя праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. «Мапет-шоў». 3-я серыя.
11.45. 20 мінут рэдактара.
12.05. «Куміры». Ліна Мкртчан.
13.00. Справы вайсковыя.
13.45. Урокі здароўя.
14.10. Хрысціянская праграма.
14.40. «Прырода і мы». Тэлечасопіс.
15.15. «9-ы маршрут». Дак. фільм.
15.55. Адраджэнне. Культурнаасветная праграма.
16.35. «Песню бярыце з сабою». Папулярныя песні розных гадоў. Частка 1-я.
18.00. Адкуль нашы карані? Народныя паданні аб паходжанні беларусаў.
18.20. «На парог мой села казка». Мультфільм.
18.30. «Песню бярыце з сабою». Частка 2-я.
19.55. Трэці тайм.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.45. «Сінема» прадстаўляе: маст. фільм «Ганг, твае воды замуціліся» (Індыя). 1-я серыя.
23.05. НІКа.
23.20. У стылі рэтра.
0.05. Навіны кіна-відэа-аўдыё.

Канал «Астанкіна»

6.00. Навіны.
6.20. Раніцняя гімнастыка.
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. У свеце матораў.
8.00. «Марафон-15» — малышам.
8.25. Зільдарада.
8.55. Аўтограф па суботах.
9.25. Інстытут чалавека.
9.55. Авіякасмічны салон.
10.10. Стыль.
10.40. «Толькі самалётам можна даляцець...»
11.30. Мультфільм. «Каралеўства неразлучных сяброў»
12.25. Справа.
12.35. Музычны кёрк.
13.05. Дак. фільм «Вяртанне».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Цэнтральны экспрэс.
14.50. Мультфільм «Дракуліта-вампіраня».
15.10. «Вікторыя». Музычнае шоў.
16.35. Тэлесерыял «АВВГД ЛТД». 10-я серыя.
17.05. Чырвоны квадрат.
17.40. Маст. фільм «Тутсі» (ЗША).
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Што? Дзе? Калі?
21.55. Мультфільм «Калісьці даўно...»
22.00. Еўропа плюс.
23.00. Навіны.
23.15. Маст. фільм «Асада Венецыі».
0.45. «Усе зоркі». Кінаканцэрт.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Свет спорту вачамі фірмы «Жылет».
7.50. Баскетбольны агляд НБА.
8.30. Калі вам за...
9.00. «Плюс адзінаццаць».
10.15. Школа буйным планам.
11.00. «На залатым ганку сядзелі». Маст. фільм.
12.10. На радзіме В. Верашчагіна.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. Зігзаг удачы.
14.20. Пілігрым.
15.05. Казырная дама.
15.35. «К-2» прадстаўляе: «Зоркі Амерыкі».
16.05. Футбол без граніц.
17.00. «Абзац».
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Вуснамі дзіцяці.
18.15. Мульці-пульці. «Рознакаляровыя гісторыі».
18.25. «Прыгоды Эн і Эндзі». Мультфільм.
19.00. Весткі.
19.25. «Кажаю цябе». Маст. фільм (СІ-бі-эс).
21.15. Антракт.
21.25. «Метад Хелграмайт». Прыгодніцкі фільм.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. «Чароўны замак». Забаўляльная праграма.
23.30. Рок супраць ксенафобіі. Музычная праграма (Германія).

27 снежня, НЯДЗЕЛЯ

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. Праграма перадач.
8.45. «Дайце мне пець». Музычны фільм.
9.35. «Скандальнае здарэнне ў Брыкмілі». Маст фільм. 2-я серыя.
10.40. Дзівосны свет. Мастак Раман Семашкевіч.
11.35 «Ку-ка-рэ-ку!» Навагодняя займальная праграма.
12.05. Час пісьма.
12.30. Конкурс дзіцячай творчасці ў Палацы прафсаюзаў г. Мінска.
13.40. «Песню бярыце з сабою». Парад прэм'ер. Частка 1-я.
15.05. «Казка пра цара Салтана», «Серабрысты званочак», «Свабодны тыран». Мультфільмы.
16.25. «Песню бярыце з сабою». Частка 2-я.
17.50. «Мапет-шоў». 4-я серыя.
18.15. Зорны баль. Пераднавагодняя сустрэча майстроў мастацтва і спорту.
13.30. «Грай, гармоніка!»
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.00. Клуб падарожнікаў.
15.50. Жывое драва рамёстваў.
16.00. Панарама.
16.40. Тэлелоцыя.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. Акцёры. А. Папанаў.
19.00. «Праграма «Ікс».
19.15. «Трыумф дзесяці гладыятараў». Маст. фільм (Італія—Іспанія).
21.00. Вынікі.
21.45. Спартыўны ўік-энд.
22.00. Рэлігійная праграма.
23.00. Навіны.
23.20. «Раніцняя зорка» ў начным эфіры.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Хрысціянская праграма.
7.55. «І напердзе яшчэ тысячы міль...»
8.10. Нядзеля ў правінцыі. Архангельск.
8.55. Фальклор.
9.25. Шэсць сотак.
9.45. «Прыгода ў каралеўстве». Мультфільм.
10.15. Аты-баты...
10.45. Тэлекрыжаванка.
11.20. «К-2» прадстаўляе. «Бывай, СССР».
12.25. «Дараэман». Мультфільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. «Не высечы...» Вядучы— У. Цветаў.
13.35. «Вішнёвы сад». Тры версіі. Міжнародны фестываль імя А. П. Чэхава.
14.35. Калядная паштоўка.
14.45. Навагодні пірог.
14.55. Познер і Донах'ю.
15.25. «Музычная легенда».
16.25. У свеце жывёл.
17.25. «Нашы любімцы». Праграма для дзяцей.
17.65. «Цудоўнае прызямленне». Маст. фільм. 1-я серыя.
19.00. Весткі.
19.20. «Цудоўнае прызямленне». Маст. фільм. 2-я серыя.
19.55. «Урок», «Дырыжор». Мультфільмы для дарослых.
20.20. «Суперразведчык». Тэлецыкл «Шпіёны».
20.50. «60 мінут».
21.50. Завяршэнне Тыдня СІ-бі-эс на Расійскім тэлебачанні.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Рок-канцэрт. Ларыса Доліна.

ЗАПРАГРАМУЙЦЕ СВАЁ ЗАЎТРА... Dainova Co Ltd

«Арганізацыя рэалізуе пакрышкі аўтамабільныя МІ-16, апрацаваныя імпартным кансерантам, са складу ў Мінску.

Тэлефон 26-24-42.

МІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ЗАМЕЖНЫХ МОЎ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

на замяшчэнне пасад:
загадчыка кафедры лексікалогіі англійскай мовы (1);
дацэнтаў кафедраў:
лексікалогіі англійскай мовы (1);
псіхалогіі (1);
выкладчыка кафедры гісторыі французскай мовы (1).
Дакументы накіроўваць на адрас: Мінск, Захарава, 21. Тэрмін падачы дакументаў — месяц з дня апублікавання аб'явы.

АТ «Кросны» і іншыя беларускія прадпрымальнікі выказваюць шчырае спачуванне прэзідэнту асацыяцыі беларускіх прадпрымальнікаў Латвіі «Беларускі шлях», сп. Яну Кабановічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

19 снежня

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Расстанемся — пакуль добрыя». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
10.00. Паказвае Брэст.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. «Снежны гарадок». Фільм-канцэрт.
11.40. Белыя і чорныя.
12.10. 20 мінут рэдактара.
12.30. «Эскізы да партрэта». Дак.фільм.
12.55. Чарнобыль: праблемы і вырашэнні. Прэс-канферэнцыя кіраўніцтва Дзяржкамчарнобыля Беларусі.
14.45. ПІК.
15.30. «Аб'ектыў — тэатр».
16.20. «За цудоўных дамі». Мастацкі фільм.
17.30. «Чыпаліна». Мультфільм.
18.10. Студэнты жартуюць... Гумарыстычная праграма.
19.25. «Фантазія». Фільм-канцэрт.
19.45. «Старонкі жорсткага быцця». Мастацка-публіцыстычная праграма прысвечаная памяці рэпрэсіраваных пісьменнікаў.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.40. «Мапет-шоў». 1-я серыя.
22.05. «Форд». Дакументальны фільм.
22.50. «Сінема» прадстаўляе: мастацкі фільм «Замужам за мафіяй» (ЗША).
23.30. НІКа.
0.25. У стылі рэтра.

КАНАЛ «АСТАНКІНА»

6.00. Навіны.
6.20. Раніцняя гімнастыка.
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. Спорт-шанц: азартныя гульні.
8.00. «Марафон-15» — малышам.
8.25. Экалагічны агляд.
8.40. НЛА: неаб'яўлены візіт.
9.30. Аўтограф па суботах.
10.00. Справа.
10.10. Медыцына для цябе.
10.50. Мастацкі фільм «Клятва».
13.20. Студыя «Палітыка» прадстаўляе.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. «Дракуліта - вампіраня» (Францыя).
14.45. У свеце жывёл.
15.35. Тэлесерыял «АВВГД ЛТД». 9-я серыя.
16.05. Чырвоны квадрат.
16.45. Хакей. Зборная Канады— зборная Расіі. 2-гі і 3-ці перыяды.
18.25. Маст. фільм «Вярніся, Лумумба!».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Што? Дзе? Калі?
21.45. «Гардэмарыны эстрады». У перапынку (23.00) — Навіны.
23.30. Мастацкі фільм «Калыханка».

КАНАЛ «РАСІЯ»

7.00. Весткі.
7.30. Баскетбольны агляд НБА.
8.00. Свет спорту вачамі фірмы «Жылет».
8.30. Праграма «03».
9.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
10.15. «Як жыць будзем»?
11.00. «Новыя казкі Шахеразады». 1-я серыя.
12.05. Мастак Ю. Міронаў.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. Тэлеконкурс юрыстаў.
14.20. Пілігрым.
15.05. «Бурда модэн» прапануе...
15.35. Непазнаны Сусвет.
16.05. Футбол без граніц.
17.00. Залатая шпора.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Вуснамі дзіцяці.
18.15. Маскі-шоў.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. Мульці-пульці. «Салавей».
19.30. «Руская песня» збірае сяброў.
21.00. Зусім сакратна.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Асарці.
23.00. Праграма «А».
23.30. Ад лібітум.
24.00. «Завяшчанне прафесара Доўля». Мастацкі фільм.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАУЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін — 32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91. Тэлефакс: 32-22-03.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларусні Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 249.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ІРАНІЧНА ПРА СУР'ЁЗНАЕ

Як застацца ў векавухах?

Калі вас здзівіла назва — просім прабачэння, але гэтае пытанне вельмі важнае. Бо звычайна даюць парады адваротнага парадку — як знайсці сябра, як утрымаць яго або як захаваць ужо існуючыя адносіны. Аднак ёсць катэгорыя маладых жанчын, якія паводзяць сябе так, быццам сапраўды хочуць застацца ў векавухах. Для іх, а таксама для тых, хто яшчэ не знайшоў памылак у сваіх паводзінах, друкуем некалькі цікавых назіранняў.

1. Будзьце цвёрда ўпэўнены, што вам суджана ўсё жыццё быць адной. Песімізм, які авалодаў вамі, зробіць сваю справу і абавязкова прывядзе да паражэнчых настрояў, якія, як і ваш панцыр выгляд, будзьце ўпэўнены, спужаюць любога мужчыну.

2. Распарадзіцеся сваім асабістым жыццём і вольным часам дакладна гэтак жа, як гэта пішуць у раманах аб старых дзеўках: вячоркі з сяброўкамі, прагулкі з пляменніцай, вячэра перад тэлевізарам, генеральная ўборка ў выхадны і г. д.

3. З усіх сіл імкніцеся быць «захавальніцай тайнаў» усіх сваіх знаёмых, кожнаму дапамагайце, райце і «ахоўвайце» шлюбы сваіх сябровак.

4. Завядзіце сабе прыяцельку (па магчымасці больш прывабную, чым вы), ва ўсім ёй даверцеся і праводзьце з ёю ўвесь свой вольны час.

5. Увайдзіце ў ролю амазонкі, якая шчаслівая і ганарыцца тым, што адзінокая, і не забывайце падкрэсліваць гэта пры кожным зручным выпадку.

6. Пазбягайце касметычных салонаў і цырульняў, дазваляйце сабе разнастайныя прысмакі, ні ў якім выпадку не купляйце абновак, бо на вас ўсё роўна ўжо ніхто не зверне ўвагі.

7. У кампаніі паводзьце сябе як незалежная інтэлектуалка, а з мужчынамі будзьце як мага больш высакамернай, любую спробу флірту з абурэннем адвяргайце, як нешта амаральнае і непрыстойнае.

8. Жывіце ў шчаслівай упэўненасці, што існуе «ідэальны мужчына», які чакае толькі вас. Ні ў якім выпадку не адступайце ад сваіх ідэалаў у адносінах да характару, знешняга выгляду і фінансавых магчымасцей чакаемага «прынца».

9. Катэгарычна адвяргайце любое запрашэнне ў кампанію, дзе будуць мужчыны, таму што нічога цікавага ад гэтай сустрэчы вы не чакаеце і таму лепш правядзіце свабодны вечар з сяброўкамі і родзічамі.

10. Пазбягайце мужчын і ніколі не сумнявайцеся ў правільнасці сваіх жыццёвых прынцыпаў.

СЯМЕЙНАЯ ПЕДАГОГІКА

Адзін дзень без натацый

«Як пражыць хоць адзін дзень без нервавання, павучанняў, узаемных крыўдаў?» — нярэдка пытаюцца бацькі. Вось некалькі парад. Паспрабуйце.

1. Будзіце дзіця спакойна: прачнуўшыся, яно павінна ўбачыць вашу ўсмешку, пачуць пяшчотны голас. Не падганяйце яго з раніцы, не тузайце з-за дробязяў, не дакарайце за памылкі і хібы, нават калі «ўчора папярэджвалі».

2. Не прыспешвайце: разлічыць час — ваша задача, і калі гэта ў вас дрэнна атрымоўваецца, то віны дзіцяці ў гэтым няма.

3. Не адпраўляйце вучня ў школу без снедання: да школьнага снедання яму давядзецца шмат папрацаваць.

4. Не развітвайцеся, папярэджваючы і настаўляючы: «Глядзі, не наравіся», «паводзь сябе добра», «каб сёння не было дрэнных адзнак» і г. д. Пажадайце яму поспехаў, удачы, падбадзёрце, знайдзіце некалькі пяшчотных слоў. У яго наперадзе цяжкі дзень.

5. Забудзьце фразу: «Што ты сёння атрымаў?» Сустракайце дзіця пасля школы спакойна, не абрушвайце на яго тысячу пытанняў, дайце расслабіцца (успомніце, як вы самі адчуваеце сябе пасля цяжкага працоўнага дня, шматгадзінных зносін з людзьмі). Калі ж дзіця надта ўзбуджанае, калі жадае падзяліцца чымсьці, не адмахвайцеся, не адкладвайце на пасля, выслухайце, гэта не зойме шмат